Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 32 (2882) Год LVI | Беласток, 7 жніўня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Гарадок весяліўся з сябрамі

На гарадоцкім урочышчы Барык буйна адгуляла дванаццатая ўжо „Сяброўская бяседа", тыдзень пасля XXII Фестывалю музыкі маладой Беларусі „Басовішча". Гэтымі двума найбольшымі беларускімі фэстамі славіцца Гарадоцкая гміна, а выступаюць на іх перад міжнароднай публікай не толькі беларускія выканаўцы і гучаць песні не толькі па-беларуску. Гурты з усяго Падляшша, Польшчы і з Беларусі, пачынаючы з адвячорка 30 ліпеня, да самай нядзельнай раніцы цешылі тысячную публіку рознага ўзросту сваім майстэрствам. Пасля дажджу ўсталявалася выдатнае надвор'е, сціхла ўедлівая камарня, і нішто не мяшала публіцы (сярод якой раіліся самаўрадавыя і ўрадавыя VIPы) здорава бавіцца пад вядомыя рытмы, у гулях фундаваных МУСіА і іншымі спонсарамі. Гарадоцкая гміна пры гэтым мела выдатную (міжнародную!) рэкламу, бо прамая трансляцыя з мерапрыемства ішла па Радыё Рацыя. Вялі сустрэчу вядомы бард, акцёр і пісьменнік ды шоўмен з Гродна Віктар Шалкевіч і маладзенькая Аня Трахімчык з Гарадка.

Як адзначыў дырэктар Гміннага цэнтра культуры ў Гарадку, арганізатар імпрэзы інжынер і журналіст Юры Хмялеўскі, „Сяброўская бяседа" стала сапраўдным народным святам, з якога ў будучыні можа ўзнікнуць беларускі фолькавы фестываль:

— Вельмі добра людзі тут гуляюць, шмат публікі прыйшло, вельмі прыемная музыка. Гэта, перш за ўсё, заслуга гэтага месца — другога такога месца ў нас на Беласточчыне я не бачу, гэта старадаўні наш Барык, магічны лес, які сам прыцягвае людзей. Спачатку мы даем слова і месца народным калектывам, бо гэта іхняе свята, — такі другі фестываль беларускай песні. Сяброўская бяседа значыць, што гэта фестываль, дзе можна пабяседаваць, паслухаць беларускую, і не толькі беларускую музыку. Гэта мая, арганізаваная мною, трэцяя бяседа. Гэтую імпрэзу прыдумаў мой папярэднік, Юрка Астапчук, у сваёй формуле. Калі яго не стала, мы мусілі прыдумаць штосьці такое, каб людзі далей гулялі. І нам гэта ўдалося. І я вельмі рады, што Юрка Астапчук, які цяпер працуе ў Міхалове, падобную імпрэзу робіць там, праз тыдзень — у гэты раз „Прымацкую бяседу", на 15-годдзе „Прымакоў". А мы змянілі „тое самае", да чаго прывыклі ўжо слухачы, і наша імпрэза яшчэ большая чым была. І мы падумалі, што каб нашыя хары, што ўслаўляюць нашу зямлю, выступілі разам з маладымі. У нашым доме культуры маем каля 10 гуртоў — народных, эстрадных, маладзёвых, і большасць з іх мае ў рэпертуары беларускія песні. Вось ансамбль „Вэна" (вядзе яго Малгажата Кнот) гэта калектыў дзяўчат з гімназіі, — існуе год, а ўжо выступаў на фестывалях. Вядома, яны іначай спяваюць, чым „Расспяваны Гарадок". Генадзь Шэмет і „Грамада" заспяваюць з „Асеннім лістом".

Генадзь Шэмет:

— Тут збіраюцца ўсе сябры, усе людзі добрай волі. Сустракаемся тут пагаманіць, паглядзець адзін на аднаго — лягчэй становіцца ад гэтага жыць. Я тут амаль штогод. Я таксама прыклаў трохі сваю руку, каб гэтае мерапрыемства ўзнікла. Раней такое забаўляльнае мерапрыемства адбывалася на трэці дзень фестывалю „Басовішча", а пачынаў тое мерапрыемства мой гурт „Грамада".

Дэпутат польскага Сейма Роберт Тышкевіч:

— Маем шмат фестываляў беларускай музыкі, але гэты адзіны, бо адбываецца ён у такім месцы, якое нельга зблытаць з якімсьці іншым. Гэтая лясная паляна стварае непаўторны настрой — тут адчуваецца беларускую музыку і фальклор, тут вельмі свойская, прыемная атмасфера сярод ветлівых людзей.

Сярод выступоўцаў — амаль поўны агляд беларускай песні. Пачалі маленькія пераможцы эстрады — Юлька Кузыка і Марыся Савіцкая з праваслаўнай пачатковай школы ў Беластоку, „Казка" з Гарадка. З тутэйшых калектываў — „Каліна" і „Калінка" з Залук, „Расспяваны Гарадок", „Асенні ліст", „Хутар", сяброўскія „Цаглінкі" з Ляўкова, „Васілёчкі" і „Куранты" з Бельска, „Верасы", „Крыніца" і „Навіна" з Мельніка, „Арляне" і „Вэрвачкі" з Орлі, „Чыжавяне" з Чыжоў, „Рэха пушчы" ды „Перапёлка" са Студыяй эстраднай песні з Гайнаўкі, эстрадныя гурты „Вясна" і „Сказка" з Беластока, „Вэна" з Гарадка. З-пад Варшавы (з Вэсолай) — „Il Canto Magnificat". З Беларусі — народны хор народнай песні „Радуйся" з Мінска. У другой частцы фэсту выступілі вядучы Віктар Шалкевіч, „Грамада" з „Асеннім лістом", „Дэкада банд" з Бельска, капэла горцаў з Жыўца (музыкі якой паходзяць з Бескідаў і Славакіі) ды „WZorkiestra" Зміцера Вайцюшкевіча. У поўнач — „The Ukrainian Folk" з Гурова-Ілавэцкага, а да раніцы да танцаў іграли гарадоцкая „Тройка" і беластоцкая „Сказка" (беларускія і ўкраінскія песні).

Народны хор „Радуйся" ўручыў „хлеб і соль" гаспадарам:

— Наш калектыў узнік у 1984 годзе. У 1990 годзе атрымаў найменне „народны" і з таго часу мы трымаем першае месца сярод мінскіх калектываў з такім званнем. На Гарадоцкую зямлю лёс прывёў нас даўно, быў гэта 1986 або 1987 год. Мы тады пазнаёміліся з калектывам „Расспяваны Гарадок"...

Стралялі феерверкі пад музыку „Гэй, сяброўская бяседа", пякліся парасяты на ражнах, людзі танцавалі ды пікнікавалі пад карабельнымі соснамі. Было весела і свойска, таксама і тым, хто прыехаў у Барык паказацца выбарцам.

Пытанне маральнага выбару

Чалавек бездапаможны, калі трапляе ў лапы сістэмы. Кожная сістэма імкнецца выключна да ўласнага самазахавання. Лёс канкрэтнага чалавека яе не тое што зусім не цікавіць, але цікавіць крыху ў іншым ракурсе, чым самога чалавека.

Гэта зразумелі ва ўсім цывілізаваным свеце. Менавіта таму там, дзе шануюць жыццё, гонар, свабоду, меркаванне і правы чалавека, усёдазволенасць сістэмы абмяжоўваецца на заканадаўчым роўні. У сістэму, якая па сваёй прыродзе абыякава ставіцца да лёсу і жыцця асобнага чалавека, стараюцца пабольш увесці людскасці, пабольш жывога чалавечага духу.

Сістэму ў цывілізаваным грамадстве стараюцца разбавіць людзьмі з-па-за сістэмы. Гэта і суд прысяжных, дзе дванаццаць чалавек з народу мусяць паглядзець на сітуацыю не толькі вачамі ахвяры, але і злачынцы, гэта і меркаванне грамадскасці, якое асвятляе свабодная прэса, гэта і кантроль над сістэмай з боку кожнага чалавека праз розныя дэмакратычныя інстытуты — свабодныя выбары, адкрытасць і галоснасць працэсаў, даступнасць інфармацыі, права абароны для кожнага.

У сістэме таксама працуюць людзі. Гэта звычайныя грамадзяне, добрыя і кепскія, мяккія і жорсткія, такія як і па-за ёй. Але гэта людзі сістэмы і яны падуладныя ёй. Сістэма іх душыць, прымушае, патрабуе, плаціць ім заробкі і надзяляе ільготамі ды ўладай. І яны стараюцца ёй дагадзіць.

Людзі па абодва бакі ад сістэмы — розныя. Кожны можа зрабіць памылку, а той-сёй можа наўмысна рабіць розныя рэчы, у тым ліку і нядобрыя. Таму тыя народы, якія ў сваім развіцці дасягнулі пэўнага разумення справядлівасці для кожнага, максімальна абмяжоўваюць уплыў сістэмы на чалавека, перш за ўсё заканадаўчым чынам. Яны, прыкладам, не дазваляюць сістэме забіваць людзей. Прычын на тое знайшлося вельмі шмат і прытым не толькі звязаных з бязлітаснасцю сістэмы. Прычыны розныя і лагічна даказаныя. Але ў Еўропе ёсць краіна, якая аддае ў лапы сістэмы чалавечае жыццё і надалей працягвае практыкаваць смяротнае пакаранне.

У Беларусі зноў расстралялі двух чалавек. Двух гарадзенцаў наша сістэма прызнала вінаватымі ў забойстве. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый ужо 27 ліпеня заявіла, што Беларусь парушыла міжнародныя абавязацельствы. У Мінск была накіраваная просьба пра забеспячэнне часовых мер абароны, каб не дапусціць непапраўнай памылкі да асоб, да якіх нібыта прымяняліся не зусім карэктныя метады дазнання.

Беларускі бок лічыць прэтэнзіі з боку ААН надуманымі. Зрэшты, чаго было чакаць з абодвух бакоў. Ясна было, што скажа ААН, і яшчэ больш прадказальнымі былі дзеянні беларускага МЗС. Справа зараз не ў іх. Справа ў тым, што не толькі не кожны беларус, але нават мала які гарадзенец чуў пра гэты расстрэл, як і пра многія ранейшыя. Хоць падзея ж не шэраговая, афіцыйная прэса, дзяржаўныя радыё і тэлебачанне не асабліва спяшаюцца падаваць гэты матэрыял на першыя палосы газет і ў пачаткі галоўных выпускаў тэле- і радыёнавін. Наша дзяржава расстраляла нашых грамадзян. Хтосьці вёў следства, іншыя запрошвалі кару, трэція выносілі прысуд, а нехта і выконваў яго. Пра гэта хіба варта пагаварыць, выслухаць тых, хто за смяротную кару, і тых, хто супраць яе ў прынцыпе.

Але ж не. Усё ціха. Сістэма ўжо ў такой стадыі ўсёдазволенасці і манаполіі на праўду, што не жадае, каб нехта абмяркоўваў яе дзеянні, тым больш каб ставіў іх пад сумнеў. І ёй ужо не важна ці дапускаем мы мажлівасць судовай і следчай памылкі, ці не, ці мы верым следству, суду, пракуратуры, і ўвогуле ці верым мы сістэме, хоць усе ведаюць, што адсутнасць веры рана або позна прыводзіць да поўнага недаверу.

А што тычыцца смяротнага пакарання, то ў XXI стагоддзі ў Еўропе гэтая праблема ўжо даўно не ў спісе пытанняў, якія там вырашае сістэма, бо гэта пытанне сумлення, маральнага цяжару і адказнасці ўсяго грамадства. І еўрапейскае грамадства ўжо канчаткова выказалася на гэтую тэму.

Віктар САЗОНАЎ

Могільнікі чалавечай жорсткасці

Могільнікі паміраюць у самоце, як людзі, хоць іх агонія расцягваецца на пакаленні. Возьмем для прыкладу могільнічак у Нарве. Схаваны ў цяні парэштак старажытных дрэў, якія выраслі разам з ім, калі памалу запаўняўся ён магіламі і разам з імі, з часам як крышыліся старыя нарваўскія роды і памяць пра іх, уступаў поля сякерам і наступаючай дзічы самасейнага кустоўя, цяпер канае самотна, пакінуты чалавечай памяццю і самімі людзьмі. А зараз за яго змуршэлым муром бяжыць рухлівая дарога ў Бельск-Падляшскі, побач якой закараніліся вякамі нарваўскія храмы, царква і касцёл, супольныя заступніцы гэтага экуменічнага месца паховін. Ці памяць аб памерлых, продках жыхароў Нарвы, і гэтых праваслаўных, і гэтых каталіцкіх, павінна зусім счэзнуць? Ці хтось дбае аб іх магілы? Ці апрача бяздомных катоў і сабак хтосьці іх яшчэ наведвае? А так, дарэчы, ці нарваўскія людзі не маюць у сабе літасці, што столькі галодных і беспрытульных стварэнняў бадзяецца па мястэчку? Вось хоць бы тая рудзенькая сука, што жабруе пад прадуктовай крамай! Некалькі месяцаў таму ашчанілася яна ў могільнікавых зараслях, якраз пры зваленым крыжы старадаўняга кавальскага вырабу. Яшчэ быллё яго зусім не зарасло...

Для палякаў, звязаных крэсавай традыцыяй з Беларуссю, скандалам з'яўляецца тое, што тамашнія ўлады не дазваляюць адбудоўваць старых польскіх могільнікаў. Кажуць пра прыклад Навагрудка. Паводле іх, тамашні могільнік змяніўся ў адходнае месца для ўсялякіх люмпенаў, п'яніц і бязглуздых лодыраў. Гэта балючае. Вядома, рашэнне беларускіх улад, якія не дазваляюць на яго аднаўленне, выклікае сама меней рознагалоссе. Напэўна такую пазіцыю можна зразумець — гэта тырчыць глыбока ў падсвядомасці кожага народа: гэтыя фобіі і рэсентыменты ў адносінах да сваіх палітычных і гістарычных суседзяў. Хопіць прыгадаць як рэагуюць палякі, загружаныя не ў меншай ступені, чым беларусы, нацыянальнымі фобіямі, калі ўкраінцы, лэмкі, немцы ці яўрэі патрабуюць павагі да сваіх продкаў пахаваных у польскай зямлі.

А калі гаворка пра павагу памерлым, дык варта прыгадаць, што непадалёк Нарвы, у ляску перад вёскай Макаўка, на яўрэйскім могільніку ўжо ад пару гадоў адбываюцца агідныя вакханаліі, вартыя помсты неба. Прымітыўнае п'янства і распуста на магілах? А чаму ж бы і не. Гэта ж нікога не цікавіць, што паміж патрэсканых мацэваў, амаль пасярод чалавечых касцей валяюцца бутлі з-пад „мазгаёбаў", скарыстаныя прэзерватывы, а на сонцы сохнуць чалавечыя кучы? Ці неяк адрэагуюць на тое гмінныя ўлады, якім даручана дбаць аб могільнікі, нават тыя пакінутыя? А хай бы адшкадавалі пару соцень злотых на куплю дошкі з інфармацыяй, што тут святое месца — месца чалавечых паховін. Можа гэта працверазіла б аднаго ці другога варвара, пакуль зусім не сп'ецца з калегамі? І на канец — што на гэта скажуць нарваўскія бацюшка і пробашч? Пры такім варварстве хай бы адно слова пратэсту прагучала з іхных вуснаў у час нядзельнай казані, хоць бы адно слова спачування...

У Калюжыцы ў Беларусі быў калісьці маёнтак Ваньковічаў, роду вельмі заслужанага для польскай і беларускай культуры. Ад двара засталіся адно парэшткі падмуркаў і некалькі сапраўды старых дрэў. Паставілі там, праўда, камень увекавечваючы Ваньковічаў, ды на таблічцы прымацаванай да яго ёсць толькі згадка пра Валенція Ваньковіча, які стварыў славутую карціну „Адам Міцкевіч на скале Аюдаг". Беларусы лічаць Валенція адным са сваіх найвыдатных жывапісцаў. Гэтаксама і палякі. На жаль, апошнія сямейнікі роду Ваньковічаў, між іншым Мельхіёр, аўтар „Na tropach Smętka", „Ziela na kraterze" ці „Bitwy o Monte Cassino", у Беларусі трактуюцца як нацыянальна чужы элемент. Так і трактуюцца магілы Ваньковічаў на калюжыцкім могільніку. Дазваляецца ім зруйнавацца, хоць, прыгадайма — гэта магілы роду аднаго з найвыдатных беларускіх мастакоў — Валенція, якому ў Беларусі нават паставілі помнік. Што ж, крывадушнасць заўсёды была нязводнай рысай палітыкі. Дурной палітыкі.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Пасля Актавы

Ва ўступе да каталога завершанай у мінулым тыдні IV Падляшскай актавы культур старшыня яе Міжнароднай мастацкай рады (ММР), аніматар культуры і этнограф Зыгмунт Цясельскі напісаў: „«Люблю тыя песенькі, якія ведаю, тых якіх не ведаю — не люблю», — кажа інжынер Мамонь, герой сатырычнага фільма Марка Півоўскага „Рэйс", выказваючы рэзка апазіцыі: „вядомае-невядомае", „свой-чужы", „дабро-зло" (...). Фестывальныя прэзентацыі маюць якраз пашырыць знаёмства здабыткаў, каб маглі іх палюбіць па прынцыпе выказаным інжынерам Мамонем". І хоць, мабыць, не аб тым думаў старшыня Цясельскі, дык сёлетні выпуск Актавы — калі назіраць ансамблі з Беларусі — фактычна ўпісваўся ў той мамонеўскі прынцып. Тры з беларускіх калектываў (мінш. хор імя Генадзя Цітовіча, „Белыя росы" і Тэатр Рада) былі добра вядомымі беластоцкай і шырэй — падляшскай публіцы. Дырэктар фестывалю, а заадно дырэктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры Анджэй Дырдал хваліўся ў час прэс-канферэнцыі перад імпрэзай:

— Для сёлетняга выпуску Актавы характэрным будзе тое, што выступіць шмат дзіцяча-моладзевых груп, і аж чатыры ансамблі з Беларусі. Мелі быць тры, ды ў апошнюю хвіліну адмовіўся ансамбль з Чачні, і мы ўзамен запрасілі „Белыя росы".

Як штогод у кулуарах ставілася пытанне, які прынцып абавязваў пры выбарах тых, а не іншых, калектываў. У гэты раз не выступіў ні адзін ізраільскі калектыў. Люсі Лісоўская, старшыня Цэнтра адукацыі Польшча-Ізраіль, сяброўка ММР, сказала мне, што з-за немагчымасці дагаварыцца з арганізатарамі не выступіў запланаваны раней ансамбль з Ізраіля.

У сваю чаргу прэзідэнт Сусветнага саюза ромаў Станіслаў Станкевіч, таксама сябра ММР, заявіў, што ёсць толькі адзін ромскі, а ў сапраўднасці беларускі ансамбль (Тэатр Рада), таму што абмежаваныя былі фінансавыя магчымасці. Зараз перад гала-канцэртам я спытаўся ў іншага сябра ММР, дзеяча Звязу беларускай моладзі Ігара Лукашука, як праходзіў адбор калектываў для ўдзелу ў сёлетняй Актаве: „Шмат залежала ад арганізацыйных магчымасцей і калектываў, і арганізатараў".

Ігар Лукашук шматзначна прамаўчаў адказ на пытанне, хто вырашаў пра выбар беларускіх калектываў. А на пытанне, ці асабіста ён (як адзіны прадстаўнік беларускага асяроддзя ў ММР) меў уплыў на іх выбар, адказаў:

— Сёлета — не. Гэта дыктавалася таксама арганізацыйнымі прычынамі. У апошнюю хвіліну аказалася, што некаторыя калектывы не маглі прыехаць, дык браліся запасныя ансамблі.

Ацэньваючы мастацкі ўзровень сёлетняй Актавы, сказаў:

— Па сваёй стылістыцы быў ён высокі. А калі гаворка пра эстэтыку, фестываль увайшоў у плынь эстраднай музыкі і апрацаванага фальклору.

IV Акатва не карысталася вялікім зацікаўленнем маладой публікі. Узрост гледачоў у сярэднім — 50 гадоў. Нечаканасцю было прысуджэнне спецыяльнай узнагароды аднаму з беларускіх ансамбляў (хору імя Цітовіча), устаноўленай дэпутатам Робертам Тышкевічам, якому забаронены ўезд у Беларусь (ён там асоба непажаданая). Са сцэны пад беластоцкай ратушшу дэпутат так тлумачыў сваю задуму: „Справа ў тым, каб падтрымаць наша суседства".

Узнагарода была ўручана кіраўніком дэпутацкага бюро Аннай Мяжынскай кіраўніку і дырыжору хору Міхалу Дрынеўскаму, лаўрэату дзяржаўнай прэміі РБ і ўзнагароды прэзідэнта Беларусі за ўклад у духоўнае адраджэнне беларускай дзяржавы. Прысутныя на ўручэнні гэтай узнагароды журналісты пыталіся паўжартам: „Ці не быў гэта воўчы білет на ўезд у Польшчу ў будучыні гэтаму ансамблю?".

Больш аб сёлетняй Актаве — на 12 старонцы.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Чым абагравацъ — драўнінай ці вугалем?

Тэкст і фота
Аляксея МАРОЗА

У Белавежскай пушчы ляжыць многа паваленай драўніны, а яе продаж абмяжоўваецца

Жыхары Гайнаўкі і навакольных сёл зараз амаль увогуле не могуць купіць у Гайнаўскім надлясніцтве драўніны для абагравання дамоў. Многія з іх рашыліся купляць вугаль, бо цэны яго самыя нізкія якраз пасля абагравальнага сезона — позняй вясной і раннім летам. Апошнім часам у дрэваапрацоўчых суполках у прыпушчанскім рэгіёне таксама абмежавалася перапрацоўка драўніны і продаж драўляных адкідаў. Абрэзкі і раздробленую драўніну людзі вельмі ахвотна куплялі для абагравання хат якраз з-за невялікай цаны адкідаў перапрацоўкі лясной прамысловасці. Некаторыя купляюць больш якасную драўніну павышанай энергетычнай каштоўнасці ў Бельскім надлясніцтве, дзе яшчэ прадаецца бярэзіна. Але там яна даражэйшая ад той з Белавежскай пушчы. Дарагі таксама транспарт у наваколле Гайнаўкі. Іншыя едуць за сухой ялінай, якая больш масава высякаецца ў Надлясніцтве Броўск пасля знішчэння дрэў караедамі. Аднак транспарт драўніны з нараўчанскага напрамку ў Гайнаўку і яе наваколле нязначны. Мяркуецца, што галоўнай прычынай недахопу больш якаснай драўніны павышанай энергетычнай каштоўнасці ў Белавежскай пушчы з'яўляецца моцнае абмежаванне гадавога ліміту высякання ўсёй пушчанскай драўніны. На 2011 год ён меншы больш чым у 2 разы ў параўнанні з мінулым годам і складае 48,5 тысячы кубаметраў.

Менш драўніны для абагравання дамоў

— Зараз не прадаюць больш якаснай драўніны ў Гайнаўскім надлясніцтве Белавежскай пушчы. Складана таксама купіць абрэзкі ў дрэваапрацоўчых прадпрыемствах. Жанчына з нашага сяла купіла дубовыя абрэзкі, але яны замоцныя для выкарыстання ў печках. Дуб у час спальвання моцна нішчыць таксама печкі цэнтральнага ацяплення. Калі мая суседка купляла якасны вугаль, я таксама рашыўся прызапасіць вугалю, бо драўніна з пушчы часта даражэ, — заяўляе мужчына з Новага Беразова.

— Я пытаўся ў Гайнаўскім надлясніцтве і сказалі мне, што ў іх не будзе ўжо прадавацца больш якасная драўніна павышанай энергетычнай каштоўнасці. Вугаль таксама дарагі, але прыйдзецца ім карыстацца, — кажа жыхар Гайнаўкі, які жыве ў прыватным катэджы.

— У гэтым годзе я купіў у некалькі разоў менш драўніны з Гайнаўскага надлясніцтва Белавежскай пушчы, чым гэта рабіў у мінулых гадах і амаль усю развёз вясной сваім кліентам. Прытым перш за ўсё было гэта бярозавае дручча, бо мала прадавалася таўсцейшай бярэзіны, а грабіны, якую я вазіў у мінулых гадах, амаль увогуле не было ў продажы. Зараз энергетычная пушчанская драўніна практычна не прадаецца ў Гайнаўскім надлясніцтве і хіба не будзе ўжо прадавацца ў гэтым годзе, бо скончыліся ліміты высечкі, — расказвае прадпрымальнік, які купляў драўніну ў Белавежскай пушчы і пастаянна развозіў яе ў прыпушчанскія сёлы, перш за ўсё пенсіянерам і людзям, якія не маюць свайго транспарту. — Зараз я купляю тоўстую бярэзіну па-за пушчай, у Бельскім надлясніцтве, і прывожу кліентам. Аднак і там драўніна даражэйшая, чым тая з пушчы. Яе транспарт таксама даражэйшы.

Грыгорый Бялецкі, надляснічы Гайнаўскага надлясніцтва ўдакладніў, што ўжо дзесяты год вядзецца гаспадаранне паводле плана ўпарадкавання пушчы і за дзевяць гадоў на тэрыторыі гэтага надлясніцтва высякалася на гаспадарчыя патрэбы ў сярэднім каля 45 тысяч кубаметраў драўніны ў год (амаль столькі, што ў гэтым годзе прызначылі на ўсю пушчу), а ў гэтым годзе можна высекчы у Гайнаўскім надлясніцтве толькі 12 тысяч кубаметраў драўніны. Аднак нават і прызначаныя ліміты не выкарыстоўваюцца, бо ёсць яшчэ ліміты высечкі і абмежаванні ў паасобных катэгорыях дрэў. Затое мясцовае насельніцтва дабілася, што драўніна з Белавежскай пушчы ў першую чаргу ідзе ў рознічны продаж і толькі калі няма мясцовых пакупнікоў, прадаецца яна ў ходзе інтэрнэтных аўкцыёнаў.

— У гэтым плане Белавежская пушча гэта выключэнне на ўсю краіну, бо толькі тут у першую чаргу ўвогуле не прадаем драўніны ў ходзе інтэрнэтных аўкцыёнаў, — сказаў надляснічы Грыгорый Бялецкі і дадаў, што цана ў рознічным продажы гэта сярэдняя цана з інтэрнэтных аўкцыёнаў плюс 15% накідкі. — Дырэктар Рэгіянальнай дырэкцыі Дзяржаўных лясоў мае права панізіць гэтую накідку і так робіць у адносінах да драўніны з Белавежскай пушчы.

Мяркуецца, што цяпер многа драўніны ляжыць у ландшафтных запаведніках і на іншых тэрыторыях Дзяржаўных лясоў у Белавежскай пушчы і абмірае, што асабліва хвалюе тых людзей, якія не могуць купіць больш якаснай драўніны павышанай энергетычнай каштоўнасці ў Гайнаўскім надлясніцтве.

— На 20 тысячах гектараў мы можам высечы ў нашым надлясніцтве толькі 12 тысяч кубаметраў драўніны ў гэтым годзе, што састаўляе ў сярэднім 0,6 кубаметра з гектара пушчы, а на кожным гектары ў сярэднім прырастае 7-8 кубаметраў драўніны ў год. Гэта абазначае, што дазволена нам высякаць толькі 10% гадавога прыросту драўніны і нідзе няма так нізкага ўзроўню высечкі драўніны, — гаварыў надляснічы Бялецкі.

Там, дзе яшчэ ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя падрад вырэзваліся вялікія плошчы Белавежскай пушчы, былі засаджаны або рассеяліся ў галоўным бяроза і вольха. Гэтым лясам зараз пад дзевяноста гадоў. Надляснічы Грыгорый Бялецкі мяркуе, што ў пушчы можа быць ажно пад 1,5 мільёна кубаметраў вольхі і падобная колькасць бярэзіны. Яны ў хуткім часе могуць састарэць, пачаць ламацца і абміраць, калі іх не высекчы ў бліжэйшым часе. Прыхільнікі павелічэння парку на ўсю пушчу таксама гаварылі, што бярозы і вольхі трэба высекчы і прадаць мясцоваму насельніцтву ў якасці апалу, бо там неабходная перабудова ляснога масіву, нават у межах парку. Чаму тады зараз абавязваюць такія невялікія ліміты высечкі драўніны для Белавежскай пушчы, зацверджаныя Міністэрствам асяроддзя, калі больш масава трэба вырэзваць гэтыя аднародна засеяныя бярозавыя і альховыя лясы? Гэта ж энергетычная сыравіна, якой не хапае ў Гайнаўцы і наваколлі. У іх месца трэба засаджваць больш шляхетныя дрэвы.

Гайнаўка і наваколле могуць больш забруджваць асяроддзе

Яшчэ ў дзевяностых гадах пачалі ў Гайнаўцы ліквідаваць малыя вугальныя кацельні Прадпрыемства цеплавой энергетыкі. Гарадская цеплавая сетка была пазней падключана да кацельні суполкі „Рындыпол", якая стала прадукаваць цеплавую энергію, карыстаючыся не толькі вугалем, але таксама драўнінай і адкідамі перапрацоўкі лясной прамысловасці. Многія жыхары прыватных дамоў таксама рашаліся часткова пераставіць абаграванне з вугалю на таннейшую драўніну і адкіды, якія прапанавалі мясцовыя дрэваапрацоўчыя суполкі. Калі ў першай палове дзевяностых гадоў забруджанасць паветра ад спальвання зімой вугалю ў наваколлі Гайнаўскага белліцэя (у гэтым рэгіёне горада якраз было самае вялікае скапленне вугальных кацельняў) была адной з самых вялікіх у Падляшскім ваяводстве і многіх іншых рэгіёнах Польшчы (па гэтым паказчыку), то гэтая забруджанасць мела таксама адмоўнае ўздзеянне на Белавежскую пушчу. Аднак пасля змены палітыкі абагравання жылых блокаў і прыватных дамоў (па эканамічных прычынах) паветра ў Гайнаўцы стала адносна чыстым, нават нягледзячы на смурод з „хімічнага" завода. Зараз, на падставе выказванняў жыхароў Гайнаўкі і наваколля, можна зрабіць вывад, што ў надыходзячым абагравальным сезоне ўзрасце ўдзел вугалю ў абаграванні як прыватных дамоў, так і жылых блокаў. Частка гарадскіх блокаў у мінулым абагравальным сезоне была падключана да гарадской кацельні ў квартале „Мазуры", якая нядаўна аднавіла сваю дзейнасць і працуе толькі на вугалі. Паколькі на рашэнне ўласнікаў дамоў у справе куплі большай колькасці вугалю, чым гэта было ў апошнім абагравальным сезоне, можа ў галоўным мець уздзеянне абмежаванне продажу драўніны ў Белавежскай пушчы і рост цэн яе, то на паўторнае адкрыццё дзейнасці вугальнай кацельні „Мазуры" мелі ўздзеянне высокія цэны продажу цеплавой энергіі прыватнай суполкай „Рындыпол", якая з'яўлялася манапалістам на гайнаўскім рынку. Аказалася патрэбным зламаць манаполію суполкі „Рындыпол", якая прадавала цеплавую энергію даражэй, чым у многіх іншых гарадах Падляшша, а таксама і Польшчы.

Канцэрт ў Саўлянах

У ліпені ў Саўляны, вёску каля Беластока, прыехаў з канцэртам музычны гурт „Point Reyes" з ЗША. Мерапрыемства — на афішах у вёсцы напісалі „пікнік" — пачалося 9 ліпеня ў 19 гадзін. Выступ адбыўся пад адкрытым небам каля мясцовай святліцы. Моладзь і старэйшыя прынеслі з сабою пледы і прыселі на мураве. З боку зялёнай спортпляцоўкі расклалі кастры.

Гадзінны канцэрт усім спадабаўся. Амерыканскія спевакі і інструменталісты захапілі слухачоў цікавай музыкай, спевам. Зацікавілі экзотыкай, своеасаблівасцю спосабу выканання музыкі. Такое застаецца доўга ў памяці.

Пасля канцэрта ўдзельнікі паселі чародкамі на мурог. На вогнішчы падпяклі каўбаскі. Кіраўнічка святліцы пусціла музыку з кружэлкі. Пачаліся танцы пад пагодлівым і ціхім небам. Панавала прыемная атмасфера. Быў час і пагутарыць са знаёмымі, і супольна паспяваць, і патанцаваць. Калі разыходзіліся дадому, набліжалася поўнач. Вечар так непрыкметна перайшоў у ноч, але ніхто не спяшаўся разлучыцца з кампаніяй.

Варта дадаць, што ў Саўлянах (Супрасльская гміна) жыхары ахвотна ходзяць на культурна-забаўляльныя мерапрыемствы. Прыязджаў у святліцу тэатр, дэманстраваліся кінафільмы. Солтыс і салэцкая рада намераны разбудаваць асяродак культуры.

Быў дом культуры

Па вуліцы Кавалерыйскай на Новым Месце ў Беластоку 35 гадоў таму я наймаў кватэру. Той дом яшчэ там ёсць і жывуць у ім людзі. Перад ім зараз не частакол, а шыферная агароджа. На падворку новы мураваны дом. Усё памянялася з цягам часу.

На Новым Месце быў дом культуры з кіназалай. Каля будынка пабудавалі танцавальную пляцоўку. Колькі моладзі тут збіралася! Дом культуры абступалі сосны.

26 чэрвеня г.г. я наведаў маё колішняе месца пражывання. А яно побач скрыжавання вуліц Кавалерыйскай з Гараднянскай. Паглядзеў наўкол і стала мне сумна. Няма таго дома культуры. Яго прадалі. Перад ім ад вясны да восені цвілі кветкі, многа кветак. А зараз у 34 бетонных вялікіх скрынках... пустазелле. У сасновым міні-парку стаіць шэсць сухіх дрэў і іх не ссякаюць. На ствалах старых сосен (яны без верхавін) развесілі драцяныя правады. Ёсць сухія сосны і з боку вуліцы Гараднянка. Травой зараслі сцежкі пад соснамі. Гэты глухі зялёны востраў заняпаў, бо прызабыты.

Ці гарадскія радныя ад мікрараёна Новае Места не бываюць на прагулцы? Чаму зараз, у разгары лета, ніхто не падумаў тут пасадзіць кветкі ды выкасіць высокую траву?

(яц)

Аб'язная прадуктовая крама

Праз маю вёску Бялкі ў Нарваўскай гміне праязджае раз у тыдзень у чацвер з раніцы мабільная крама з Беластока. Яе ўласнікам з'яўляецца „PHT Szanta" Паўла Баўтручука, 15-521 Беласток, Засцянкі, вуліца Засцянская, 190. Прадаўцом у ёй працуе малады ветлівы чалавек. Падкажа ды пакажа пакупнікам свой тавар, параіць. Найважнейшае, што тут нядорага, і прадавец сур'ёзны. Шмат там можна чаго купіць, і заўсёды атрымаеш рахунак з фіскальнай касы. Каб больш было такіх прадаўцоў!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Фота і тэкст Ганны КАНДРАЦЮК

КУРЫ ЗЯЛЁНАНОЖКІ, МАРЫХУАНА І ЛЫСЫЯ ГОРЫ!

— Пані Тэрэзко, а чырвоных кароў калі разводзіць будзеце?

— Давайце найперш пасадзім агародчыкі з зёлкамі, — студзіць запал дырэктар Сувальскага ландшафтнага парку Тэрэза Свярубская. Каб у наш тэлевізійны час навучыць людзей добрага і карыснага ў гаспадарцы, патрэбны час. Людзі адразу жадаюць чырвоных кароў! Бо так сказалі па тэлебачанні. Што прыбытак ад іх канкрэтны. І лугі адраджаюцца. А даіць тых кароў хто ўмее?

— *А то трэба даіць кароў?*

У праектах аднаўлення старых сельскагаспадарчых культур найбольш ахвотна ўдзельнічаюць *варшавякі*. Так на Сувальшчыне называюць усіх новых асаднікаў, нават калі яны з Кракава. Мясцовыя трымаюцца збоку. Ну, хіба што прапанова біёлагаў будзе карыснай. Так было ў выпадку курэй зялёнаножак, якія гадамі разводзіць парк. Аплачаецца. За адно яйка *злот пяцьдзесят* плацяць. Купцы самі на панадворак прыязджаюць. Кажуць, у тых яйках халестэрыну няма.

З зёлкамі больш складаная справа. Хто схоча гадаваць пустазелле ў агародзе? Столькі кветак на рынку. Амерыканскія, японскія, афрыканскія. Глядзіш, галава ад колераў кружыцца. Агародчык павінен цвісці ад вясны да зімы. Фантанчык туды яшчэ прыстроіць, рыбак чырвоных пусціць. Словам — люкс. А зёлкі — што яны такое? Які ў іх выгляд?

* * *

Каб агранізаваць майстар-класы, прысвечаныя лекавым і прыдатным у кухні раслінам, працаўнікі парку патрабавалі гадоў. Шмат у чым дапамагла ім курка зялёнаножка. Яна першая „зламала" неахвоту і страх перад новымі гатункамі. Спадабаўся і праект аднаўлення традыцыйных відаў садовых дрэў. Ад двух гадоў парк прапануе (дарма) жыхарам навакольных гмін дрэўкі з маліноўкамі, антаноўкамі, рэнетамі, фергамотамі, венгеркамі. Пад уплывам адукацыі і практычнай гаспадаркі шмат-хто з мясцовых памяняў адносіны. Ад удзельнікаў майстар-класаў я даведалася, што самае цэннае ў Рамінцкай пушчы дрэва... чарэшня. Панямецкая. Ёй за восемдзесят гадоў. Людзі як шалёныя бяруць памаладкі і прышчапляюць іх у сваіх сучасных агародчыках. Праз гады выспеюць плады.

Калі гаварыць пра ахову лекавых зёлак, найлепш гаварыць праз страўнік. Палова ўсіх раслін, якая расце ў нас пад нагамі, ядомая. Некаторыя з іх, напрыклад, хрэн, мацярдушка ці гурэчнік выдатна падносяць смакавыя якасці страў. У апошні час фурор робіць мядзведжы часнок. Яго садзяць нават у банальных агародчыках з фантанам. Мода, як не цікава, прыйшла з багатай Скандынавіі — ад рэстаўратара, які на аснове зёлак (асабліва мядзведжага часнаку) адкрыў адзін з найдаражэйшых рэстаранаў свету. Месца ў рэстаране трэба браніраваць на два месяцы раней. На высмакаваную вячэру прылятаюць рускія алігархі і амерыканскія бізнесмены. Поспех шведскага рэстаўратара ў многім дапамагае ахоўнікам лекавых раслін. Яго прыклад дзейнічае на мазгі сучаснага чалавека больш за ўсякую экалагічную адукацыю. Людзі пачынаюць разумець, што патрэбнае для смаку і здароўя можам адшукаць у агародчыку бабулі. Іншая праблема — вярнуць тыя агародчыкі з мятай, марыянкай, мелісай, рамонкам, наготкамі, дзікай мальвай, шалфеем, майранам, любчыкам, рутай ці атрутнай цыкутай.

— Каб павярнуць уяўленне ў бок лекавых раслін, мы думаем арганізаваць конкурс на бабулін агародчык, — кажуць працаўнікі парку. — Сучасны чалавек любіць конкурсы.

* * *

Зёлкі памалу заваёўваюць і польскі рынак.

— Каб вы ведалі, які бізнес людзі круцяць на зёлках, — смяецца зяляр Пятро Кярсноўскі. — Патрапяць прадаць звычайныя каноплі за марыхуану.

Таму на ўсіх абучэннях ён як агню пазбягае парамедыцынскіх навук. Людзі з неверагоднай лёгкасцю прымаюць усякія „аздараўляльныя" парады.

— Nie wiadomo dlaczego na Podlasiu w ostatnim czasie ludzie zapijają się samogonem z bukwicą? To zioło przecież nie jest bezpieczne...

Пятро Кярсноўскі, зяляр і пчаляр у адной асобе, вядзе гербарыі пры Музеі сельскай гаспадаркі ў Цеханоўцы. Свае веды абгрунтаваў на вопыце славутага Кшыштафа Клюка. Як не цікава, яго аповеды пра свет лекавых раслін пазбаўлены ўсякай магіі.

— Чалавек павінен ведаць пра практычны бок раслін, — кажа. — Часам расліны, якія мы лічым пустазеллем, дапамагалі выжыць у час голаду. Для нас карысна вярнуць у састаў дыеты прызабытыя смакі. Ніякія прыправы з магазінаў не дараўняюць зёлкам, сабраным на лугу ці вырашчаным у агародчыку.

Сам дакладчык прывёз з сабой некалькі відаў зёлкавых кампазіцый, каб прадаць іх удзельнікам майстар-класаў. Вядома, найбольшай папулярнасцю карысталася пасыпка для бутэрбродаў на аснове мядзведжага часнаку!

— Нам важна, што такія майстар-класы мяняюць свядомасць земляробаў і жыхароў вёсак, — кажа дырэктар парку. — Чалавек пачынае глядзець пад ногі і ўжо не патопча такой расліны.

* * *

Мне самой, крышку даадукаванай у сучаснай маладзёвай літаратуры з магічным ухілам, было цікава, якія людзі прыязджаюць на зёлкавыя майстар-класы. Сярод удзельнікаў найбольш мяне ўразіла Люцына Гоін, энергічная пенсіянерка, *варшавянка* з Сілезіі. Яна амаль уляцела ў залу з вялізнымі кашамі. Іх састаў адразу апынуўся на стале, прыаздобленым зялёным сукном:

— Прошэ се чэнстоваць! — заахвоціла яна.

Я, зразумела, пакаштавала яе чорнага хлеба з зернем чарнушкі і базіліі, спечаным на лістку хрэну. Хлеб можна было яшчэ пашмараваць модным шмальцам з мяткай або свойскім маслам з любчыкам. Бачучы маё задавальненне ад добрага смаку, пані Люцына сказала:

— Я пра агратурызм думаю. І хлеў, такі яшчэ панямецкі, каменны, аднаўляю. На пакоі. Прыязджайце. Мой адрас: Лысыя Горы, 1.

— Ы-ы.

— Ну так, я сапраўдная ведзьма, — усміхнулася як сонца круглатварая, прыгожая цётка.

Народная вышыўка ў Беларускім музеі

Анджаліна МАСАЛЬСКАЯ

15 ліпеня 2011 года ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы адбылося адкрыццё выстаўкі Тамары Грышко і Тамары Нягерыш. Тэма выстаўкі — „Народная вышыўка". Аўтаркі выстаўкі родам з Брэста. Там яны працуюць і развіваюць свае зацікаўленні. Яны з'яўляюцца ўдзельніцамі клуба „Творчасць". Клуб, які знаходзіцца побач з кінатэатрам „Мір", існуе ўжо звыш 10 гадоў. У ім 8 асоб, якія пастаянна ўдзельнічаюць у штодзённым жыцці клуба. Галоўная мэта іх працы — перадаць маладому пакаленню тое, што адыходзіць у забыццё, а менавіта майстэрства рукадзелля, перш за ўсё вышыўкі.

На адкрыццё выстаўкі ў Беларускі музей прыйшло шмат людзей розных узростаў. Усе прысутныя маглі асабіста паразмаўляць з аўтаркамі выстаўкі і бліжэй пазнаёміцца з метадамі іх працы. Выстаўку можна глядзець штодзённа ад гадз. 9 да 15 з панядзелка да пятніцы ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы.

Музей і асяродак Беларускай культуры ў Гайнаўцы пастаянна супрацоўнічае з беларусамі з Беларусі. Не так даўно ў музеі адкрылася выстаўка графікі „Лясныя казкі" Аляксандры Стэльмашонак. Гэта вынік супрацоўніцтва Беларускага музея і Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы. Культурны цэнтр Беларусі і Пасольства Рэспублікі Беларусь дапамагаюць музею таксама фінансава, напрыклад, пры праекце „Рамонт кіназалы", за што кіраўніцтва і працаўнікі Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы вельмі ўдзячныя. Спадзяемся, што справа беларускай меншасці ў Польшчы далей будзе супольнай.

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Нестабільнае лета

Сёлета ў гаспадарцы будзе цяжкі год. Натура не паскупілася на сюрпрызы. Як не трыццаціградусная спёка, то працяжныя ліўні з ураганамі. Такія ваганні надвор'я не спрыяюць земляробу. Не толькі ствараюць закалот у палявых работах, але прыносяць урон грамадскасці: паводкі, разбураныя жылыя дамы і гаспадарчыя будынкі, парваныя энергетычныя лініі. Вынік гэтых анамалій бачым і ў сельскай гаспадарцы — жніва зацягваецца. Канец ліпеня, а нівы даспелага збожжа стаяць на полі. Калісьці казалі, што „на Пятра баба хлеба напякла" (12 ліпеня — прыхадское свята Пятра і Паўла ў Дубічах-Царкоўных). У Кузаве, напрыклад, яшчэ ніхто не зажынаў жыта, хоць традыцыйна аднавяскоўцы выходзяць у поле 15 ліпеня. А як у наваколлі?

Панядзелак, 25 ліпеня. Ранішнім цягнікам адпраўляюся ў Кляшчэлі на кірмаш, каб пацікавіцца цэнамі сельскагаспадарчых пладоў. Са станцыі ў мястэчка дабіраюся на ровары. А сёмай рынак амаль пуставаў. Адны купцы стаялі побач латкоў выстраеных у шарэнгу паабал праязнога бруку. На пачатку спаткаў Валодзю — агародніка з Шарнёў. Прадаваў агуркі. Карнішоны адборныя па 2-2,50 зл. за кілаграм цаніў.

Фурманак з парасятамі я не прыкмеціў. Казалі, што зранку былі дзве. Цанілі па 220 зл. за парку. З продажам парасят не было праблемы, але былі праблемы купіць збожжа. У свой час заспеў я на пляцоўцы толькі адзін аўтамабіль. Сужонства з Грабаўца прывезла авёс і трыцікале. Гэтае апошняе раскупілі мігам па 100 зл. за цэнтнер. З аўсом было горш. Хоць гаспадар цаніў па 30 зл. за мяшок, ахвотных не было. Большасць пытала пра трыцікале і мяшанкі на корм. Гэтых не хапала.

— Прычыны не трэба далёка шукаць, — гаварыў чалавек з вёскі Чаромхі. — Людзі маюць шмат зерня ў запасе, але не спяшаюцца са збытам. Не ведаюць які плён будзе сёлета. Прыйдзецца пачакаць да восені. Зараз патрэбна селяніну спрыяльнае надвор'е, каб закончыць жніва і звезці плён у стадолу. Работы накапілася. Не паспееш жніва закончыць, а тут трэба бульбу капаць ды сеяць.

Знаёмы кляшчэлевец на рынку казаў:

— Па Ілы бярыся да раллі. Ілью Прарока адзначаем 2 жніўня, затым 7 жніўня — Ганну. А гэта ўжо восень!...

Кляшчэлеўскі рынак пакідаў я перад восьмай. Людзей на кірмашы не прыбавілася. Да чыгуначнай станцыі паехаў я па жвіроўцы між сенажацямі. Трава някошаная, парастае пустазеллем. Ці на гэта паўплывала сёлетняе надвор'е ці рыначная эканоміка — цяжка сказаць. Факт застаецца фактам.

Пару слоў да кнігі

Чытаючы кніжку Аляксандра Вярбіцкага „Па жвіроўках, асфальтоўках" хачу аднесціся да адной неапісанай з ліку многіх важных сітуацый там згаданых. Зазначаю, што гэта не дзеля крытыкі аўтара, а для гісторыі.

Хацеўшы звярнуць на гэта ўвагу аўтара, я пазваніў яму, каб па тэлефоне падзяліцца думкай, але адчуў, што ён схацеў даведацца чаго я хачу — па-за тэлефонам. Дык, адчакаўшы пару тыдняў, сядаю за машынку і пішу. Гэта і чытачам, мабыць, спатрэбіцца.

Справа ў тым, што ў кніжцы тамсям напісана аб дзейнасці польскага пасляваеннага падполля тут, на Беласточчыне, а няма ні слова аб злачынствах у Вярхлесе. Я прывяду ўрывак пісьма мне тамашняга ўраджэнца, надрукаваны ў выданні „Księga hańby": „30.04.1945 roku do wsi Wierzchlesie wkroczył duży oddział AK w sile około 1500 ludzi, po zęby uzbrojony. Z uwagi na nieobecność sołtysa — Mikołaja Kisiela — zostawiono mu kartkę, aby na 7 maja przygotował lnianego płótna na onuce, kosze jaj, masła, serów i innej żywności, w tym mięsa. Kartkę podpisał dowódca tej grupy mjr Maciej Rózga. Sołtys bał się konsekwencji, więc musiał wykonać polecenie pisemne. 7 maja ten sam oddział przyszedł zabrać przygotowaną żywność i płótno. Wieś została okrążona, by nikogo nie wypuścić. Po zastrzeleniu sołtysa i zabraniu ludzkiego dobra oddział odjechał. W tym dniu, a była to Wielka Sobota wyznawców prawosławia, ojciec sołtysa był w cerkwi ze święconką. Gdy został powiadomiony, że banda zastrzeliła jego syna — przybiegł na podwórze, postawił obok syna koszyk ze święconym, zebrał mózg do czapki i zapłakał: „Chrystos uwaskros i ty synok uwaskreśniesz". Cała ludnośc wsi płakała, bo był dobrym człowiekiem. Miał 40 lat, zostawił żonę i dwoje dzieci. Innych, którzy wtedy zbiegli, banda zamordowała potem — zimą z 1945 na 46-ty".

Думаю, што гэты фрагмент пісьма паказвае лёс людзей Беласточчыны ў той перыяд, калі польскія „патрыёты" іх знішчалі, замест ісці дабіваць гітлераўскіх людаедаў.

Наогул кніжка цікавая і павучальная, добрая і патрэбная. Віншую!

Васіль ПЕТРУЧУК

Горад прыгажэе

Папрыгажэў Беласток у раёне вуліц Каліноўскага, Млыновай і Кіеўскай. Цяпер тут ужо новыя артэрыі. Вуліца Кіеўская ў дзевяностыя гады XIX стагоддзя мела такі выгляд: драўляныя дамы, шопкі і брук з палявога каменя. На вуліцы Млыновай была кузня.

Зараз будзе здзіўлены кожны, хто яшчэ нядаўна хадзіў вуліцай Грунвальдскай і Сасновай. Першая з іх — цяпер прадаўжэнне вуліцы Каліноўскага. Зніклі драўляны дамы па вуліцы Сасновай.

Перабудоўваюць найбольш вядомую вуліцу Ліпавую, між іншым, сякуць ліпы і пашыраюць тратурар. Яшчэ сёлета пасадзяць новыя 40 штук ліп і 60 — у наступным годзе.

7 ліпеня г.г. здалі ў карыстанне — пасля перабудовы — вуліцу генерала Мачка. Мае яна даўжыню 3,3 км.

Зараз па вуліцы Каліноўскага ідзе пабудова Падляшскай оперы і філармоніі. У ёй будзе глядзельная зала на 1028 месц. Аб'ект плануюць здаць у карыстанне ў верасні 2012 года.

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі



Чаму „Небасклон”? Натхненне найчасцей прыходзіць ноччу, калі ляжыш і глядзіш праз акно на мільёны зорак, якія акружаюць ззяючы месяц. Або калі ляжыш на траве, цябе грэе цёплае сонца, а ты глядзіш на гэты небасклон, па якім плывуць хмаркі. І шукаем розныя формы: там паляцеў трусік, там цмок, там матылёк, а там...

Рэдакцыя нашай газеты таксама бярэ натхненне, спаглядаючы ў небасклон. Мы вельмі часта лунаем у воблаках і цяжка нас сцягнуць на зямлю. Для нас не лічацца толькі асобы, з якімі мы размаўляем. Калі месца, у якім прыходзіцца ствараць, мае тое „нешта”, натхненне нас не пакідае. Тэмы самі просяцца ў галовы. Бора-Здруй гэта асаблівае месца. Некаторыя з нас тут ужо не першы раз, але заўсёды знаходзяць новыя тэмы. Магу смела сказаць, што месца гэтае адоранае добрым духам. Бора-Здруй з’яўляецца нашым рэдакцыйным небасклонам, з якім прапануем пазнаёміцца і нашым чытачам.

Міхаліна Герасімюк, *галоўны рэдактар сустрачанскай газеты „Небасклон”*, выпускніца Белгімназіі ў Гайнаўцы
Уля Беразавец, *намеснік галоўнага рэдактара*
Оля Конюх, *сакратар,* **Лукаш Філіпюк**, *графік*
Журналісты: **Патрыцыя Ігнацюк, Патрыцыя Нармантовіч, Дар’я Сержан, Оля Варшыцкая**

ЖУРНАЛІСТКА, МУЗЫКАНТ, ФАТОГРАФ

Міхаліна Герасімюк, або як называюць яе сябры *Міха*, на Сустрэчах „Зоркі” ўжо трэці раз. Яна з усіх нас найбольш ведае пра журналістыку. З верасня яна пойдзе ў першы клас Гайнаўскага белліцэя. Два разы ў месяц Міхаліна разам са сваім сябрам Міранам Марчуком вядуць беларускую маладзёвую перадачу па Радыё „Рацыя”. Наша сяброўка вельмі звязаная з Беларуссю. Яе мама, Наталля Герасімюк, нарадзілася на беларускім баку мяжы, у горадзе Высокае. Калі мы пыталі *Міху* пра яе планы на будучыню, яна адказала: — *У мяне многа часу і я буду пра гэта думаць.*

Калі гаварыць пра зацікаўленні, яе хобі — музыка. Міхаліна іграе на гітары. Часта яе можна пабачыць з фотаапаратам. Я думаю, што ў будучыні многа дзвярэй будзе адкрытых для гэтай дзяўчыны.

Паўліна Ваўранюк, *Індывід*, Гімназія ў Нарве
Супрацоўніцтва: **Дарка Вапа**, Гімназія № 7 у Беластоку

Галубцы ці вада з бутэлькі?

У ходзе Сустрэч „Зоркі”, якія адбыліся ў агратурыстычным пансіянаце Бора-Здруй, гаспадар Барыс Казлоўскі паказаў нам свой дабытак. Мы былі ў скансэне, дзе пабачылі як калісь жылі людзі. Тады спадар Барыс пачаў тэму ежы:

— Вы то яшчэ выглядаеце, але калі прыехалі дзеці з Гданьска... — ён літасціва кіўнуў галавой. — Многія з іх гэта хворыя людзі, — дадаў.

Ён сказаў нам пра шкоднасць спажывання вады з пластмасавай бутэлькі. Вада з Бора-Здруй вельмі карысная здароўю. Гэта погляд чалавека, які выхаваўся на вёсцы. Аднак мы, людзі з гарадоў, не маем доступу да вады з калодзежа. Адзін выхад — вада з бутэлечкі.

Спадар Барыс сказаў яшчэ, што найлепшая ежа — тая, якую робяць самастойна. Яна — уцеха для страўніка. У пару камп’ютараў многа тоўстых людзей. Трэба есці мала, трымаць дыету. Але калі я спрабавала дранікаў, бліноў і галубцоў, якія выйшлі з рук спадарыні Людмілы і яе дочак, я перастала думаць пра дыету. І кажу вам, што лепш з’есці блінчыкі і быць круглым, чым глядзець на горы смачнай яды і абыходзіцца адным смакам.

Дарка Вапа, *Індывід*, Гімназія № 7 у Беластоку

Маё я! Хто і адкуль мы?

— *Kto ty jesteś?*
— *Polak mały.*

Гэты вершык нам кажуць вывучаць яшчэ ў дзіцячым садку. Паляк? Так — я грамадзянка Польшчы. А ці я ўжо паляк? Я ведаю адказ на гэтае пытанне. Я — перш за ўсё беларуска! Гэта мая нацыянальнасць, мая культура, мая маёмасць, маё „я”. Я — грамадзянка Польшчы, жыву паводле законаў маёй краіны, аднак гэта зусім не мяшае мне быць беларускай. Я ведаю, хто я. Мае бацькі з маленства гавораць да мяне па-беларуску, яны выхоўвалі мяне у адпаведнасці з традыцыямі продкаў, у духу нашай нацыянальнай культуры. Я адчуваю ў сабе повязь пакаленняў.

Калі падарожнічаю падляшскімі вёскамі, я ўслухоўваюся ў гаворку старых людзей, што сядзяць на лавачках. Чую родную мову. І раптам з панадворка выбягае малое дзіця. Яно прыехала на канікулы да бабулі. Дзіця пытае пра нешта бабулю, а тая, ломячы язык, адказвае яму па-польску. Чаму?

— Яно не разумее па-нашаму, — скажа старая.

Дык яно ж не чужое! Хай вучыцца ад бабулі нашай мове. Стаю і думаю: калі нашыя дзяды развучыліся гаварыць да дзяцей па-свойму? Калі яны сваіх дзяцей палічылі чужымі? Ці тады, калі тыя выязджалі з вёскі ў горад? І яны не ведалі сказаць хто яны і адкуль? Ці можа тады, калі іх бацькі набывалі ім гарадскія кватэры ў блёках? А можа тады, калі ў іх дзяцей нарадзіліся свае дзеці? І яны, каб малым было лягчэй у жыцці, загаварылі да іх па-польску?

Дзе знайсці нам правільны адказ на пастаўленыя пытанні?

Я сама нашу свае карані ў сабе і мне яны не замінаюць. Але чаму іншыя людзі ўцякаюць ад сваёй душы і каранёў? Чаму не хочуць пазнаваць саміх сябе?

Міхаліна Герасімюк, *Небасклон*, выпускніца Белгімназіі ў Гайнаўцы

Зацікавіць светам раслін і жывёл

Гутарка з людзьмі пушчы: Эвай Мароз-Кэчынскай і Андрэем Кэчынскім, супрацоўнікамі Белавежскага нацыянальнага парку

Індывід: *— Адкуль у Вас любоў да прыроды?*

Андрэй Кэчынскі: — Яна са мной ад пачатку, можна сказаць, што я яе высмактаў з малаком маці...

Эва Мароз-Кэчынская: — У маім выпадку было інакш. Прырода заўсёды была навокал і мы на яе не звярталі ўвагі. Пасля я навучылася яе любіць.

АК: — А я заўсёды ведаў назвы кветак і дрэў, якія раслі ў наваколлі. Мяне ўсяму гэтаму вучыла бабуля. Я вывучаў прыроду ва ўніверсітэце і сам развіваў зацікаўленні.

Індывід: *— Дзе Вы пазнаёміліся, можа ў пушчы?*

ЭМ-К: — У самым цэнтры Белавежы.

АК: — На старадаўніх усходах.

ЭМ-К: — Па якіх хадзіў сам цар. Муж спяшаўся... вядома, у лес, а мне трэба было ў бібліятэку, якая была закрыта. Андрэй меў з сабой ключ.

АК: — Пасля мы размаўлялі...

Індывід: *— А ці сынам перадаяце ідэі, якія датычаць прыроды?*

АК: — Так, мы стараемся іх зацікавіць светам раслін і жывёл і перадаць тое, што атрымалі ад сваіх бацькоў (*у размову ўключаецца сынок Кацпер:* — Я хаджу з татам у лес, мы аглядаем разам фільмы пра прыроду).

Індывід: *— Ці ёсць у Вас нейкія дадатковыя зацікаўленні?*

ЭМ-К: — Так!

АК: — Я займаюся фатаграфіяй. Люблю, напрыклад, рабіць здымкі пчолкам. Пчалярства цікавіць мяне ад заўсёды, гэта сямейная традыцыя.

ЭМ-К: — Я люблю рабіць рэканструкцыю гістарычных помнікаў, а таксама шчыра паразмаўляць з людзьмі.

Індывід: *— Вы ездзіце па вёсках Падляшша і Беларусі. Ці бачыце многа розніц у выглядзе хат? Якія Вам больш падабаюцца?*

ЭМ-К: — Не магу адказаць на гэтае пытанне, бо ўжо даўно я не была ў Беларусі, а культура — працэс жывы, яна мяняецца ўвесь час.

Індывід: *— Якія Сустрэчы „Зоркі" Вам найбольш запамяталіся і чаму?*

ЭМ-К: — Мае першыя Сустрэчы былі адзінаццатыя па ліку, у Студзіводах. Я не ведала як перадаць дзецям этнаграфічныя веды, але аказалася, што там было многа моладзі з пасіяй і не было праблем. Былі толькі праблемы, калі ідзе пра паводзіны трох удзельнікаў. Я адчула тады паразу на выхаваўчым грунце. Былі яшчэ такія Сустрэчы, калі мы вандравалі пешшу праз пушчу, і я як гід заблудзіла... Памятаю яшчэ Сустрэчы ў Нарве, калі мы з Ганнай пайшлі да курганоў і яна мне заспявала. Да сёння гэта памятаю!

Індывід: *— Куды збіраецеся паехаць на канікулы?*

ЭМ-К: — У нацыянальныя паркі. Мы хочам найперш пабачыць усе паркі Польшчы.

АК: — Усім нам, цэлай сямейцы, вельмі спадабаўся Славінскі нацыянальны парк. Часта вяртаемся туды ў думках.

Апрацавала **Дарка Вапа,** *Індывід,* Гімназія № 7 у Беластоку

Музыка з кайфам

Кайф ад музыкі

http://new.racyja.com

Пазітыўныя вібрацыі на „Басовішчы"

Прыхільнікам добрай музыкі на апошніх выхадных вельмі цяжка было знайсці сабе месца. Хутчэй за ўсё „іх насіла" з месца ў месца. Бо і як тут вырашыцца: слухаць „Тройцу" ці „ДахуБраху" супольна з „Порт Монэ", слухаць Сіла ці „Нейра Дзюбель", „Zero-85" ці „De Phazz"?

Мабыць, некаторым не было праблемы, бо слухаюць толькі рок ці толькі джаз, тады выбіралі адзін з фестываляў і не задумваліся над іншымі прапановамі. Але калі ў трох месцах выступаюць зоркі, якіх варта пабачыць, нягледзячы на ўсё, тады будзь мудрым... Тры фестывалі на адных выхадных гэта зашмат нават для тых, якія на машыне могуць пераехаць усюды. Але дзе тады час на рэфлексію, на сустрэчы з сябрамі, гутаркі, і г.д. Але! Пра якія фестывалі тут ідзе гутарка, напэўна не ўсе ведаюць. Першы — „Басовішча", наш, свойскі, беларускі, хаця ў гэтым годзе вельмі часта чулася, што гэта польска-беларускі фестываль, бо і найбольшыя зоркі сёлетняй праграмы з Польшчы („R.U.T.A." і „Tymon&Transistors"). Другі фестываль, на шэсць гадоў малодшы за „Басовішча", прайшоў у Чаромсе. „З вясковага падворка" адбыўся шаснаццаты раз („Басовішча" — дваццаць другі). Што цікава, гэта не толькі ўжо фестываль фольк-музыкі. Можна назваць яго фестывалем этнічнай музыкі Цэнтральнай Еўропы, бо выступаюць там гурты, між іншым, з Польшчы, Беларусі, Украіны, Славакіі, Чэхіі, Венгрыі. Каб падкрэсліць характар (але і вялікую дапамогу спонсора — Вышаградскага фонду), гэты фестываль мае таксама другі член у назве: „Visegrad Wave"! А трэці фестываль? У сталіцы Падляшша, Беластоку, у двары Палаца Браніцкіх вялікі польскі музычны дзеяч вырашыў наладзіць фестываль, на якім прэзентуе сваю любімую музыку ў стылі chill out. Фестываль мае назву як дзесяць выпускаў альбома з музыкай „Пазітыўныя вібрацыі". Цягам двух дзён у цэнтры Беластока згодна з назвай усё вібравала ў рытме пазітыўных гукаў ды эмоцыяў.

Несумненна кожны фестываль меў свой характар і хаця можа кепска, што якраз тры выпалі ў адзін час, але з другога боку, жывем у сапраўды культурным і вельмі актыўным у музычным плане рэгіёне.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка

№ 32

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Ператоча-2011

Культура і традыцыя яднаюць

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Хаця на белавежскім „Ператочы” збіраецца намнога менш публікі, чым на раней ладжаным у гэтым самым месцы „Купаллі”, многія людзі прыязджаюць на мерапрыемства, арганізаванае Фондам „Царкоўная музыка” з Гайнаўкі дзеля яго асаблівай атмасферы. Пераважная частка публікі збіраецца перад сцэнай, якая сваім афармленнем напамінае „пэрэточэ” (намаляваныя на ёй дзверы ад клуні), а астатнія размяшчаюцца далей ад сцэны, каб на адкрытым паветры, за столікамі з халоднымі напоямі і цёплымі стравамі глядзець выступленні і размаўляць на розныя тэмы. Людзі прыязджаюць у Белавежу, каб паслухаць у галоўным фальклорную музыку ў выкананні калектываў з Падляшша, іншых мясцовасцей Польшчы і замежжа, найчасцей з Беларусі. Мерапрыемства прыцягвае цэлыя сем’і. Бацькі прагульваюцца з дзеткамі па белавежскім амфітэатры і наваколлі, затрымліваюцца каля ларкоў, купляюць харчаванне, цацкі, сувеніры і крыху інакш, чым звычайная публіка, адпачываюць на фоне фальклорнай музыкі. Можна так праводзіць час на „Ператочы”, бо адбываецца яно ў турыстычнай Белавежы, дзе летам турыстаў чакае багатая прапанова. У гэтым годзе IX Белавежскія мастацкія інтэграцыі „Ператоча-2011” праходзілі 29 і 30 ліпеня ў час даволі добрага, як на дажджлівы перыяд, надвор’я і з публікай цікавай прапанаванага арганізатарамі рэпертуару.

— Прыгожае і шыкоўнае месца побач Белавежскай пушчы, у якім ладзіцца „Ператоча”, і камфортнае сёння надвор’е, бо не зацёпла і не захаладна, спрыяюць мерапрыемству. Прыемна паглядзець як людзі сядзяць побач сцэны і з задавальненнем слухаюць музыку, — сказаў прафесар Уладзімір Зяневіч, мастацкі кіраўнік Ансамбля Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтва „Грамніцы” з Мінска.

Прафесар Зяневіч патлумачыў, што рэпертуар славутага калектыву абапіраецца ў галоўным на фальклорныя песні, запісаныя ад сялян, у тым ліку і на Беласточчыне. Пасля аказалася, што „Грамніцы” былі адной з галоўных зорак мерапрыемства. Выступілі яны стройна і займальна з цікавым рэпертуарам пад інструментальную музыку. Побач песень мінчанкі запрэзентавалі народныя танцы, а нават заахвоцілі публіку гуляць перад сцэнай.

Сярод сабраных, апрача жыхароў Гайнаўшчыны, было шмат турыстаў. Частка публікі магла трапіць на „Ператоча” выпадкова, пры нагодзе адпачынку ў Белавежы, але я ўпэўнены, што большасць прыехала спецыяльна.

— Гэтае мерапрыемства цікавае як для турыстаў, так і для мясцовага насельніцтва, — заявіў белавежскі прыродазнаўца Януш Корбель, якія рабіў фатаграфіі ў час імпрэзы.

На мерапрыемстве традыцыйна найбольш выступіла беларускіх калектываў — бо ажно пяць. Перад сабранымі запрэзентаваліся таксама польскі, яўрэйскі, цыганскі, татарскі, нямецкі, літоўскі, расійскі і лэмкаўскі калектывы.

— Мы на дзевятае „Ператоча” запрасілі прадстаўнікоў дзевяці нацыянальнасцей, якія пражывалі або і жывуць на нашай тэрыторыі. Маглі б мы яшчэ запрасіць шведаў, французаў ці прадстаўнікоў іншых культур, якія ў нас жылі. Нашае мерапрыемства гэта месца адкрытых дзвярэй і адкрытасці нашых жыхароў на ўсе іншыя нацыянальнасці, якія прыбылі на нашыя землі. Накіраванае яно як да турыстаў, так і да нашага насельніцтва, да людзей, якіх цікавіць добрая і разнародная музыка. Тэрмін „пэрэточэ” — месца перад варотамі ў клуні — сімвал культурнага і сяброўскага жыцця на нашай тэрыторыі, бо тут адбываліся і вяселлі, і вясковыя забавы. У час Белавежскіх мастацкіх інтэграцый прэзентуюцца духовыя вартасці асабліва разнароднай тэрыторыі, маючы на ўвазе культуру, веравызнанне і нацыянальнасць мясцовага насельніцтва. Прэзентацыя культур нацыянальнасцей, пражываючых на нашай тэрыторыі, вельмі важная, бо набліжае жыхарам гісторыю нашай зямлі, на якой мы жывем, і выклікае рэфлексіі і разважанні наконт нашага мінулага, — лічыць галоўны арганізатар мерапрыемства, старшыня Фонду „Царкоўная музыка” ў Гайнаўцы Мікола Бушко, які разам з Барбарай Кендысь вялі мерапрыемства на польскай і беларускай мовах.

Калектыў песні і танца „Bezwianka” з Астрові-Мазавецкай

Дуэт „Зараніца” з Крынак

Вельмі шыкарна выступілі мінскія „Грамніцы”

З песнямі на беларускай і расійскай мовах, запісанымі пад Крынкамі, цікава запрэзентаваўся дуэт „Зараніца” з Крынак — Іаанна Чабан і Галена Пухальская.

— Мы не мяняем ні слоў, ні мелодыі песень, толькі стараемся трымацца той, якую ўчулі ад нашых бабуль. Канешне, прыстасоўваем запісаную песню ад адной асобы для выканання ў дуэце, — сказала Іаанна Чабан.

Калі „Зараніца” стала спяваць, спытаў я жанчын з ляўкоўскіх „Цаглінак”, што яны думаюць наконт выступлення крынкаўскага дуэта.

— Гэта не нашыя кабеты, пэўна з Беларусі прыехалі, — сказалі згодна дзве жанчыны з Ляўкова.

Дуэт, які месяц таму адсвяткаваў год сваёй дзейнасці, выканаў беларускія і расійскія песні з вялікай увагай на адметнасці беларускай і расійскай фанетыкі. Фанетыка і выкананне песень „Цаглінкамі”, якімі кіруе Мікалай Мяжэнны, таксама былі на высокім узроўні. Іх рэпертуар і стройны выступ зацікавіў публіку.

— На мерапрыемстве пануе добры клімат, прысутнічае разнародная публіка. Турысты цікавяцца нашымі песнямі і нашай музыкай, — сказаў Мікалай Мяжэнны.

Абодва дні белавежскага мерапрыемства пачыналіся з прагулак выканаўцаў на брычках па мясцовасці і кароткага канцэрта трубачоў з Белавежскага нацыянальнага парку. Жыхары Белавежы з асаблівай нецярплівасцю чакалі выступлення мясцовага калектыву „Ручаёк”. Ад імя замежнікаў запрэзентаваліся тры калектывы, у тым ліку два калектывы з Беларусі — фальклорная „Орліца” з Навіцкавічаў і згаданыя „Грамніцы”. Расійскі Калектыў песні і танца „Balet Flores” з Пецярбурга выступіў шыкарна і, таксама як і калектывы з Рэспублікі Беларусь, здабыў асаблівае прызнанне публікі.

— Мы адчуваем неабходнасць прэзентавання і абавязак напамінання сённяшнім жыхарам, а таксама шматлікім турыстам, якія наведваюць наш рэгіён, аб культурах народаў, якія жылі і жывуць на тэрыторыі Белавежскай пушчы і яе наваколля, — заявілі арганізатары мерапрыемства.

Ад імя палякаў выступіў Калектыў песні і танца „Bezwianka” з Астрові-Мазавецкай, танцы, спеў і сцэнкі якога спадабаліся сабраным. Ад імя татараў запрэзентаваўся калектыў „Buńczuk” з Беластока з аўтарскімі вершамі на польскай мове, песнямі і танцамі характэрнымі для татарскай культуры. Нямецкія песні і культуру прэзентаваў вакальны калектыў „Nowe Trio” з Рэнскай Вёскі. Удала выступілі таксама Яўрэйская вакальная група „Szir awiw” з Варшавы, Літоўская народная капэла „Salcinis” з Сейнаў, Лэмкаўскі калектыў песні і танца „Ластівочка” з Пшэмкава і Цыганскі калектыў „Perła i bracia” з Канстантынава-Лодзінскага. Здаўна вядома, што культура і традыцыя яднаюць, а ў выпадку „Ператоча” паказваюць таксама адметнасці характэрныя для пасобных нацыянальнасцей. Ад некалькіх гадоў арганізаванне „Ператоча” стала фінансаваць Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, а імпрэзу падтрымліваюць і выступаюць яе суарганізатарамі Белавежскі нацыянальны парк, Белавежскі асяродак культуры і Белавежскае аддзяленне Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства, бо бачаць патрэбу ўзбагачаць культурнае жыццё Белавежы — лясного асяродка вядомага на ўсю Польшчу.

У пушчанскай глыбіні

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Нядаўна заязджаў я ў Белавежу і маю ўвагу прыцягнуў магутны прыродны лесапавал абапал шашы, што з Гайнаўкі. Тое мноства паваленых прыродай старых дрэў, якіх не краналі людскія рукі, наводзіла мне думку пра надта строгую ахову нашай Белавежскай пушчы на цэлым яе абшары, не толькі на заселеных аўтахтонным насельніцтвам яе акраінах. Падумаў я тады паглядзець як жа выглядае тая ахова ў самым цэнтры пушчы. Спадзяваўся я і там пабачыць паваленыя на волю дзікай прыроды магутныя дрэвы ў яшчэ большай колькасці, паглядзець, колькі драўніннага дабра, колькі мільёнаў там марнуецца. Прайшоўся я дарогай з Белавежы цераз Грудкі ў Чарлёнку.

Асфальтоўка з Белавежы ў Грудкі пралягае ў густым і высокім жолабе сакавітай зелені і ў агульнасці нагадвае адмыслова і рупліва дагледжаную паркавую алею. Перад самой вёскай перасякае яна чыгуначную лінію, якая зарастае не надта высокай травою. Намнога буйнейшая трава расце на пероне чыгуначнага прыпынку, які не так здаецца яшчэ даўно — гэта па маіх мерках, бо каля трыццаці гадоў таму, там былі ўрачыста здалі ў карыстанне. Сёння той прыпынак можна назваць антрапагенным помнікам наступаючай прыроды...

У Грудкі я не заходзіў, бо не ў вёску я напраўляўся, толькі менавіта ў адлеглую ад людзей пушчанскую глыбінку. Лясная жвіроўка ў бок Чарлёнкі, паралельная да чыгуначнай лініі, пралягла сярод бору, значыць па аднаснным узвышшы, што не павінна нават здзіўляць, узяўшы пад увагу назву вёскі — Грудкі. Здзівіла мяне іншае — адсутнасць прыроднага лесапавалу. І прысутнасць звычайнай высечкі дрэў у самой пушчанскай глыбінцы. За гэтым узнікла ў мяне пытанне: чаму такая галосная ахова Белавежскай пушчы не кранае яе нетраў, толькі кранае акурат заселеныя аўтахтонным насельніцтвам яе акраіны? Падказку на гэтае пытане далі мне даследаванні майго асабістага чытача Міхася Куптэля, вынікі якіх ён абнародаваў у 27-м нумары «Нівы», пішучы пра «лес, якога не кранала чалавечая рука тысячамі лет». Наш выдатны абаронца першабытнага лесу трывожыцца адсутнасцю гаспадарскага падыходу прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва, «каб самаўрады пры дапамозе парламентарыяў, бурмістраў, войтаў больш заняліся думкай як стварыць новыя месцы працы». Сам аўтар нічога для гэтай думкі не падказвае: ці гэта мела б быць здабыча прыроднага газу, ці нейкая капальня золата або вугалю, ці нейкі сорт *silicon valley*, мяркую, што гэтай падказкай не ломяць сабе галавы і тыя 250 тысяч падпісантаў за пашырэнне нацпарку. У якім напрамку той нацпарк пашыраць, гэта таксама не трывожыць экалагічных заўзятараў. Хацелася б і мне нешта станоўчае прыдумаць, толькі мае шэрыя клеткі ў гэтай справе акурат шэрыя як бетон.

Мяне, аднак, захапіла іншае захапленне майго асабістага чытача: «Калі б самаўрады згадзіліся на пашырэнне пушчы, то 75 мільёнаў сплыло б у прыпушчанскія гміны на ўсё, што датычыць мясцовага насельніцтва! Не нейкага іншага, варшаўскага, куяўскага, сілезскага...». Толькі аўтар вельмі лёгка аднёсся да сплыву гэтых мільёнаў, быццам яны скіраваны акурат мясцоваму насельніцтву. Наогул такія дары абкладзены засцярогамі, што яны не на раздаванне насельніцтву, толькі на інфраструктуру на тэрыторыі, дзе тое насельніцтва пражывае, у гэтым выпадку найчасцей на ўтылізацыю сцёкаў: на каналізацыю ці прыдамовыя ачышчальні. Калі мясцовыя людзі страцяць крыніцы ўтрымання — а не толькі пра драўніну тут мова, але і пра сельскую гаспадарку, якая становіцца немагчымай у выніку наступу ўзбуйненых зграяў лясной звярыны на культуры — тады ім стануць непатрэбнымі і тыя мільёны, тыя каналізацыі і ачышчальні. Яны стануць шукаць сабе месца ў іншых мясцовасцях, дзе самаўрады, мабыць, больш занятыя «думкай, як стварыць новыя месцы працы». А іх пакіданыя нерухомасці купяць сабе на дачы багатыя і ўплывовыя насельнікі «варшаўскага, куяўскага, сілезскага...». І пакарыстаюцца тымі мільёнамі. Варта было б, каб мой асабісты чытач пачытаў не толькі мае тэксты, але і пацікавіўся, якім шляхам адбывалася вытурванне аўтахтоннага насельніцтва ў іншых рэгіёнах свету: Паўночнай ці Паўднёвай Амерыцы, Палесціне, Велькапольшчы. І добра было б, каб мой паклоннік заглянуў у Кампіноскую пушчу з боку Варшавы — там ужо стала цесна...

І яшчэ адно пра тыя бачаныя Міцкевічавым «шкельцам і вокам» мільёны. Яны казённыя і іх раздаюць чыноўнікі. Толькі тыя чыноўнікі не мясцовага маштабу, але дзяржаўнага, але гэта — на што можа спадар Куптэль не надта звярнуў увагу — таксама чыноўнікі. Раздаючы тыя галосныя мільёны яны разлічваюць на захапленне гэтай шчодрасцю прынамсі 250 тысяч зялёных заўзятараў пашырэння пушчы, а гэта намнога большая падтрымка ў час чынадайных парламенцкіх выбараў, чым ад штораз больш згортванага прыпушчанскага насельніцтва. Тыя казённыя мільёны — гэта чысты адкат у кішэні менавіта варшаўкі.

Міхась Куптэль патрабуе: «Можа хтосьці з рэдактараў адкажа мне на пытанне, чаму ў справе Белавежскай пушчы «Ніва» стаіць толькі па адной старане, а не аб'ектыўна, як належыць журналісцкай прафесіі, паказвае чытачу аргументацыю не толькі самаўрадаў Нараўчанскай, Гайнаўскай ці Белавежскай гмін, але і прадстаўнікоў асяроддзяў, якія змагаюцца за строгую ахову пушчы». Калі ласка.

Пушчанская экасістэма беспамылкова выкрыла ў маёй асобе, што я «прыхільнікам пашырэння пушчы не з'яўляюся». У час вандроўкі ад Грудкоў у Чарлёнку мяне разлютавана заатакавалі слепакі. Калі я спыняўся, умомант мая вопратка чарнела ад іх. Калі ішоў, лютых аваднёў станавілася на мне менш, але і так нанёс я ўрон пушчанскай экасістэме велічынёю ў нейкую сотню гэтых джалабойных абаронцаў першабытнай пушчы. Калі б ехаў я на веласіпедзе, можа б іх, можа б высечак, можа чаго іншага — не заўважыў бы нават. І не было б пра што пісаць.

У Звярынцы стаіць копія бронзавага помніка зубра, які быў калісь там пастаўлены ў памяць палявання расійскага імператара Аляксандра II ў 1890 годзе. Статуя пушчанскага цара, так як і належыцца цяперашняй модзе адносна помнікаў ці то мінуўшчыны, ці то прыроды — з хібай. Як глыбіня пушчы без аховы, так і той бронзавы зубр — без хваста...

Грудкі



Помнік зубра ў Звярынцы

Чыгуначны прыпынак у Чарлёнцы

Да новых сустрэч у Бандарах!

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Кожны год „Бандароўская гасцёўня” — беларускае свята на „аседлі” ў Бандарах — як магніт прыцягвае гасцей з розных куткоў Падляшша. У гэты дзень шматгадзіннаму канцэрту самадзейнікаў спадарожнічаюць мастацкія выстаўкі, забаўляльныя атракцыёны, сяброўскія сустрэчы, танцы і жарты. Сцэнарый „Бандароўскай гасцёўні” рыхтуе салэцтва на чале з новаабраным солтысам Бандароў Марыяй Грыка і новаабраным радным Янкам Бароўскім. Асаблівай увагі заслугоўвае супрацоўніцтва салэцтва з уладамі Міхалоўскай гміны і Беларускага грамадска-культурнага таварыства.

Публіка „Бандароўскай гасцёўні”

Калектыў „Цаглінкі” са Старога Ляўкова

Ужо 11 раз прагучала песня „Мой Беластоцкі край” на словы ўраджэнца Бандароў Алеся Барскага, якая традыцыйна пачынае мерапрыемства. Так было і 16 ліпеня 2011 года. Затым з прывітальнымі прамовамі выступілі старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі, старшыня Рады гміны Міхалова Багуслаў Асташэўскі, солтыс Марыя Грыка. Мерапрыемства ўдастоілі беларускія дыпламаты — консул Таццяна Нікалаёнак і намеснік дырэктара Культурнага цэнтра Беларусі Дзяніс Вялічка.

Пасля афіцыёзу прыйшла чарга на мастацкія калектывы. З асобай цеплынёй публіка прыняла выступленні Монікі Каліноўскай і Паўла Макарэвіча з Міхалова, лаўрэатаў школьнага конкурсу „Беларуская песня” Наталлі Алексяюк з Тапалян і Адрыяна Данілюка з Міхалова, беластоцкіх гуртоў „Калінка”, „Ас” і „Крыніца”, калектываў „Цаглінкі” са Старога Ляўкова і „Прымакі” з Міхалова ды ансамбля „Церніца” з Мінска.

Да танца падыгрываў калектыў „Ас”. Быў кірмаш рукадзелля народных майстроў, працавалі ларкі з музычнымі і кніжнымі выданнямі. Удзельнікаў свята чакала шмат атракцыёнаў, а ў іх ліку конкурсы з узнагародамі.

У час канцэрта наглядаў я як радасцю і задавальненнем зіхацяць вочы гледачоў. Вядома, на сцэне выступаюць не чыноўнікі па пытаннях песні і музыкі, толькі адораныя людзі з глыбокай душой. Сустрэча з беларускай песняй у нас гэта заўсёды свята — чыстае, лагоднае, светлае.

Сэрца радавалася, калі на сцэне выступаў ансамбль беларускай песні „Церніца” Мінскага Палаца культуры і спорту чыгуначнікаў. Мінскія артысты адкрылі нам цудоўны свет песні і танцаў. У ансамблі 20 удзельнікаў, а займаюцца з імі мастацкі кіраўнік Галіна Несцяровіч і музычны кіраўнік Іосіф Несцяровіч. У час выступлення я стаў марыць, каб фэст у Бандарах ператварыць у „Міжнародную Бандароўскую гасцёўню” з удзелам некалькіх калектываў з Беларусі. Цешу сябе думкай, што мары нярэдка збываюцца…

Нашы беларускія гурты гэта заслуга шырокага кола самадзейнікаў і арганізатараў музычнага жыцця. Я лічу, што нашы гурты здзяйсняюць грамадзянскі абавязак захавання і папулярызацыі нашай культурнай спадчыны.

Хутка праляцеў час, а развітвацца з калектывамі не хацелася. З публікі несліся словы шчырай удзячнасці: „Дай Бог і ў будучыні спяваць ім цудоўныя песні!”.

Развітанне заўсёды пакідае смутак у сэрцы… „Але не развітваемся мы з цудоўнай публікай надоўга”, — сказалі артысты. Тады да новых сустрэч!



Нягледзячы на ўзмоцненае падаўленне грамадзянскай актыўнасці ў Беларусі — чаго вартыя апошнія прапанаваныя змены ў заканадаўства, калі сумеснае бяздзеянне на вуліцы з'яўляецца правапарушэннем — прагу людзей да праяўлення сябе ў грамадскай дзейнасці не забіць. Прычым гэта тычыцца не толькі сталіцы, дзе такая актыўнасць натуральна большая, але і перыферыі. Адным з прыкладаў гэткага праяўлення з'яўляецца так званы Магілёўскі цэнтр стратэгічнага развіцця „Імпульс”, пазнаёміцца з якім можна на сайце **http://centerimpuls.com.**

Нягледзячы на рэгіянальнасць тэматыкі — сацыяльна-палітычныя, эканамічныя, экалагічныя, гісторыка-культурныя і іншыя праблемы горада, будова сайта вартая сталічных вэб-старонак. З першага позірку ў вочы кідаецца назва арганізацыі — напісанне, выкананае ў шэра-бела-чырвоных колерах, прываблівае такой колеравай гамай, якая спалучае ў сабе строгасць і жывасць.

Галоўная старонка падзелена на дзве часткі. Вузкая левая не нясе многа карыснай інфармацыі. З яе можна перайсці да акенца для запытанняў юрысту, паглядзець колькі карыстальнікаў і з якіх краін было на сайце, а таксама клікнуць на адзін з патрэбных сабе тэгаў, што рухаюцца нібыта вакол нейкага шара. Правы бок галоўнай старонкі аддадзены пад анонсы навінных паведамленняў. Да гонару аўтараў сайта, практычна ўся інфармацыя тычыцца выключна рэгіянальных пытанняў, не выходзячы на ўсебеларускі ці сусветны абшар. Гэта значыць, што кампілятары гэтай стужкі навін нацэлены на расповед аб сваім горадзе, а не на звыклае капіяванне паведамленняў буйных інфармацыйных агенцтваў.

Усе выйсці да рубрык сайта месцяцца ўверсе выяўлення вакол назвы арганізацыі. „Перад сабой мы ставім мэту далучыць грамадскасць горада да абмеркавання пытанняў стратэгічнага развіцця Магілёва праз стварэнне грамадскай дыскусійнай вэб-пляцоўкі. У якасці віртуальнай пляцоўкі мы прапаноўваем старонкі нашага сайта, — распавядаюць яго ўладальнікі на старонцы „Пра нас”. — Мы ставім перад сабой задачу ўцягнуць як мага болей людзей да абмеркавання найбольш актуальных напрамкаў стратэгічнага развіцця горада. Мы будзем выяўляць і актуалізоўваць сацыяльна-палітычныя, эканамічныя, экалагічныя, гісторыка-культурныя і іншыя праблемы горада. Мы хочам, каб наш горад стаў сапраўдным беларускім горадам, цэнтрам Усходняй Еўропы, з развітай інфраструктурай, спрыяльным эканамічным мікракліматам і сацыяльнымі гарантыямі для яго жыхароў”. Аўтары сайта спадзяюцца, што да абазначаных імі праблем з прапановамі іх вырашэння далучацца іншыя неабыякавыя грамадзяне.

Разам з тым сябры „Імпульса” распавядаюць як цяжка ім без разумення з боку рэгіструючых органаў — спроба рэгістрацыі ў магілёўскіх абласных улад пакуль скончылася нічым.

Нейкім незразумелым дзяленнем інфармацыйных паведамленняў з'яўляецца падзел іх на „Навіны” і „Аналітыку”. Размешчаныя там матэрыялы мала чым адрозніваюцца адно ад аднаго формай падачы, якая ёсць менавіта навіннай. Вартая ўвагі старонка „Архіў апытанняў”, дзе месцяцца пытанні, цікавыя адміністрацыі сайта, і пададзены на іх адказы наведвальнікаў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

„Магутны Божа”

Адзін мой брат па веравызнанні неяк прызнаўся, што ходзіць на набажэнствы найперш для таго, каб у канцы імшы супольна заспяваць з іншымі прыхаджанамі ўрачысты гімн „Магутны Божа”. Ён, канешне, утрываў, але я таксама неяк злавіў сябе на думцы, што без гэтага выканання не было б паўнаты наведвання царквы. Гімн „Магутны Божа” настолькі арганічны, што падаецца ўжо амаль кананічным.

На золку нашага суверэнітэту ў беларускіх асяродках ішла надзвычай жывая, часам зацятая, дыскусія на тэму, якому з гістарычных гімнаў быць дзяржаўным. Апроч твора „Магутны Божа” фігуравалі, зразумела, „Мы выйдзем шчыльнымі радамі” аўтарства Макара Краўцова і знакамітая „Пагоня” Максіма Багдановіча. Пры ўсёй павазе да двух апошніх, усё ж яны толькі яскравы зрэз часу і хоць актуальныя сэнсава (на жаль!) і сёння, але ўсё ж абмежаваныя ў гістарычнай прасторы. „Магутны Божа” — гімн вечны, на ўсе часы, пакуль зямля круціцца пад сонцам, пакуль жыве Беларусь. І што важна, гэтая малітва не прывязаная да нейкай адной канфесіі, па вялікім рахунку яна адпавядае нават не толькі хрысціянам, але і прадстаўнікам іншых рэлігій. Да ўсяго „Магутны Божа” — не проста рэлігійная, але і духоўная песня. Адзін з вядомых палітолагаў нядаўна публічна выславіўся, што беларусы — зусім не рэлігійная, а хутчэй атэістычная нацыя. Можа яно і так. Але тым больш нам патрэбны такі гімн як „Магутны Божа” з яго глыбокай пранікнёнасцю. Для таго, каб хоць у якой ступені пазбыцца абыякавасці і баязлівасці, зайздрасці і сквапнасці, паўсюднага брыдкаслоўя і татальнага п'янства, многа чаго іншага заганнага, а прыдбаць тыя рысы, якія ўзвышаюць чалавека, лучаць яго з Усявышнім, арганічна змушаюць думаць пра вечнае. А што датычыць нібыта „нясвецкасці”, то не баяцца ж, прыкладам, амерыканцы дзяржаўнага дэвіза „Нацыяй кіруе Бог”. То і мы не мусім цурацца нашага выдатнага гімна і сумняваццa зрабіць яго агульнанацыянальным. Пакуль, аднак, гэта толькі мары, у краіне пануюць зусім іншыя ідэалы і парадкі. Калі б нашым дзяржаўным гімнам быў „Магутны Божа”, а не бесхрыбетнае і аморфнае, не падмацаванае нацыянальнай традыцыяй „мы беларусы, мірныя людзі”, то дакладна ў Беларусі не было б культу савецкага, не было б знікнення людзей, не было б смяротнага пакарання, не было б пераследу за перакананні і ўдзел у грамадска-палітычным жыцці.

З 1993 года ў слаўным некалі Магілёве пачаў праводзіцца аднайменны міжнародны фестываль духоўнай музыкі. Ён набіраў папулярнасць і быў узорам высокага харавога і вакальнага майстэрства. Лаўрэатамі фестывалю, на які прыязджалі як прафесійныя, так і аматарскія калектывы, былі розныя выканаўцы. На жаль, у сённяшніх умовах гэтае свята культуры сталася незапатрабаваным, так як і ўсё сапраўднае наша, беларускае. Але сам гімн „Магутны Божа” спяваецца на многіх беларускіх імпрэзах і акцыях, ён прыдатны і пры ўшанаванні палеглых, і перад пачаткам кожнай справы.

Верш „Малітва” быў напісаны паэткай Наталляй Арсенневай у страшным 1942 годзе, калі таталітарныя гітлераўскі і сталінскі рэжымы змагаліся паміж сабой і нішчылі беларускую зямлю. Цікава, што айчынныя царкоўныя дзеячы адразу „Малітву” не прынялі. Але кампазітар Мікола Равенскі стварыў на верш Арсенневай кампазіцыю такой адметнасці і гарманічнасці, што гімн намнога перажыў сваіх аўтараў. Перажыве „Магутны Божа” і ўсіх нас. Бо, як вядома, рукапісы не гараць, а музыка вечная.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Вясковыя сядзібы гараджан

Увайшло цяпер у моду, што гарадскія жыхары купляюць на вёсцы апусцелыя дамы або пустыя ўчасткі і там будуюцца або прыязджаюць на адпачынак. Бывае, што перайшоўшы на пенсію, перабіраюцца ў вёску на пастаяннае жыхарства.

У нашай вёсцы Бялкі, што ў Нарваўскай гміне Гайнаўскага павета, некаторыя выхадцы, якія пражываюць у Беластоку, атрымалі ў спадчыну па сваіх бацьках будынкі ці ўчасткі. Пачынаюць яны рамантаваць хаты або ставяць новыя будынкі. Даглядаюць свае сядзібы „на шасцёрку". І вось хачу пару такіх асоб прадставіць, пачынаючы ад пачатку Бялок. Люцына Маленда атрымала спадчыну па бацьках, сплаціла сестрыну і братаву часткі і прыгожа даглядае маёмасць, перакрыла хату і хлеў. Спадар Лажны купіў апусцелыя будынкі, шмат уклаў у іх грошай, дабудаваў да хаты пакой, перабудаваў хлеў, дзе плануе парабіць жылыя памяшканні. Тамаш Гілеўскі адкупіў ад цёткі хатку, упарадкаваў панадворак — цяпер нават прыгожа падзівіцца. Мікалай Андраюк восенню мінулага года купіў пляц пад пабудову дома, абгарадзіў яго, упарадкаваў. Лідзія Мукасей сядзібу атрымала ў спадчыну ад цёткі, цяпер пачала рамонт хлява, робіць парадак у хаце і на панадворку. У Валянціны Міхальчук будынкі і ўчастак па бацьках; хату адрамантавала і ўпарадкавала. Аркадзь Галубоўскі мае сядзібу ад сваіх цесцяў. Жыхар Беластока, родам ад Крушынян, купіў будынак былой крамы (у народзе званай „майсенеўкай"), прыгожа яго адрамантаваў і ўпарадкаваў на дачу, прыязджае на адпачынак. Яўген Вайткоўскі атрымаў у спадчыну хату па цесцях, прыгожа яе разбудаваў. У яго агародчыку растуць прыгожыя кветкі. Гэты грамадскі дзеяч усё лета прабывае ў вёсцы, спявае ў царкоўным хоры. Уладзімір Андраюк хату атрымаў у спадчыну па цётцы, Ніна Казлоўская — па бацьках. Кожны даглядае свайго панадворка. Жыхар Беластока Барыс купіў будынкі з сядзібай, прыязджае ў Бялкі на ўік-энды. Люба Садоўская купіла будынак па былой школе, цяпер жыве там з дачкой, а іх падворак — увесь у кветках. Рамановічу, жыхару Заблудава, участак і будынкі дасталіся ад бабулі, адрамантаваў іх. Іван Міранюк атрымаў будынкі ад бацькоў, аднавіў іх і жыве ў Бялках цэлае лета. Іван Паўлючук мае хату і гаспадарчыя будынкі па маці, у вёску прыязджае на ўік-энды. Пятро купіў паўгектара зямлі, упарадкаваў яго, думае будавацца. Адзін жыхар Беластока купіў дом з падворкам і дакупіў кавалак зямлі па-суседску Тамаша Гілеўскага, адрамантаваў хату і прыязджае з сям'ёй на ўік-энды. Аліна Гаўрылюк хату па бацьках прыгожа адрамантавала і прыязджае ў Бялкі на ўік-энды. Аня атрымала будынкі і гаспадарку па бацьку, дакупіла яшчэ па-суседску дзяржаўны кавалак — вельмі прыгожа ўсё адрамантавала. Яўген Раеўскі атрымаў участак і агарод ад бацькі, пабудаваў дом, прыгожа ўсё абгарадзіў, прыязджае на выхадныя, таксама і Васіль Астапчук, і Зоя Барсукевіч. На канцы вёскі адзін чалавек купіў сабе пляц пад пабудову дома, зрабіў падмурак і жалезныя стаўбы для агароджы і жалезныя паясы, з трох бакоў, каб прыкрунуць да іх астраколы, і кавалак ужо абгарадзіў. У мінулым годзе злодзеі адкрунулі тыя жалезныя пасы, паліцыя не знайшла віноўнікаў. Сёлета зноў зладзеі адкрунулі пасы з астраколамі, пакінулі толькі два пралёты. Да гэтай пары не знайшлі віноўнікаў! Цяпер малады Мікалай апусціў рукі і страціў ахвоту далей рабіць...

Так выглядаюць Бялкі з прыгажэйшага боку. А ёсць у нас і такія жыхары Беластока, што маючы тут свае ўчасткі і будынкі, аб іх не клапоцяцца. Вось на панадворку Сцяпана А., які пакрыў хату бляхай, на падворку расце пустазелле вышэйшае за плот. Сёлетняй вясной ніхто не наведаў участка, каб навесці тут парадак. Іншы жыхар Беластока купіў пляц у 0,40 га пад пабудову, а на ім расце лес і пустазелле; той жа самы ўласнік купіў школьны будынак у Сацах Нарваўскай гміны, ды і там усё нішчэе. Я асабіста гэтага не бачыў, але той чалавек у вёсцы Бялкі пасварыўся з суседзямі і нават падаў на іх у суд. Цяпер на ягоным пляцы выводзіцца толькі ваўкам і дзікам, і гэта сароміць усю вёску. Трэці ўчастак з будынкамі — спадарства Параскевы і Васіля Петрашкевічаў, што адышлі ўжо з гэтага свету. Іх дачка і ўнукі жывуць у Беластоку, а за сядзібу ніхто не плаціць і ёю не займаецца. Мне здаецца, што гэтым павінен заняцца гмінны самаўрад у Нарве.

У зямлі нашы карані

Сёлета мінае 150 гадоў з таго часу, калі беларускія сяляне атрымалі на ўласнасць зямлю. Расійскі цар „освободитель" Аляксандр II вырашыў адмяніць у 1861 годзе прыгоннае права, даць зямлю мужыкам. Не мог цар пры гэтым пакрыўдзіць пануючы дагэтуль клас памешчыкаў-прыгоннікаў. Рэформа была задумана так, каб памешчыкі нічога не трацілі.

Зямлю сяляне вымушаны былі выкупіць за вялікія грошы, якіх звычайна яны не мелі. Таму 80% выкупнай сумы давала памешчыку дзяржава, а 20% на працягу некалькіх гадоў плаціў сам селянін. На сялянскі карак зваліўся доўг дзяржаве, які трэба было плаціць на працягу 49 гадоў і які называўся „выкупнымі плацяжамі". Практычна да I сусветнай вайны сяляне з вялікімі працэнтамі выплацілі „плацяжы". Памешчыкі ў сваю чаргу атрыманыя за зямлю грошы паклалі ў банк на працэнты, што давала ім немалы прыбытак. Некаторыя гісторыкі пішуць, што сяляне атрымалі мала зямлі. У маёй Альхоўцы было 18 зямельных надзелаў па 18 дзесяцін кожны. Царская дзесяціна гэта 1,09 гектара. Значыць, у 1861 годзе кожны гаспадар атрымаў 19 з паловай гектара зямельных угоддзяў. Апрацаваць рукамі, без машын такі „ўчастак" было нялёгка. Цяжка ўявіць, што тварылася тады ў вёсках. Пэўна было і радасна і боязна! Частка сялян адмаўлялася ад подпісу „ўстаўных грамат" і павіннасцей. Многія хацелі атрымаць зямлю без выкупу.

У 1861 годзе фактычна ліквідавалася назаўсёды паншчына ў царскай дзяржаве, а сяляне станавіліся вольным саслоўем.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Словы сардэчнага спачування Марыі і Анатолю Парэмбскім з прычыны напаткаўшага іх гора — смерці сына Рамана

— выказвае калектыў „Нівы".

07.08 — 13.08

(22.03. — 20.04.) Не будзеш гнацца за рызыкай, а смакаваць красу спакойнага жыцця. Не зусім схаваешся ў хатнім зацішшы — зоркі 9-13.08. нашлюць табе мілую кампанію. Зважай на тое з кім кантактуешся, бо не кожны будзе табе спрыяць. Не еж смецця!

(21.04. — 21.05.) Да 9.08. будзеш самаўпэўнены, дакладны, здзейсняцца абяцанні. З канца тыдня пачнуцца змены, чакаюць поспехі. Знакаміты настрой. З раўнавагі можаш выбіцца толькі 13.08. (поўня Месяца), калі штосьці ляпнеш або купіш барахло — у гэты дзень тры разы ўсё абдумай!

(22.05. — 22.06.) Пільнуйся ад 7 да 10.08. — хтосьці цябе можа падмануць. Лепш будзе ў другой палове месяца. Можаш здабыць чыёсьці сэрца. 7-8.08. заляцяць табе ў галаву задумы, здавалася б, геніяльныя, ды зусім нятрапныя; слухай разумных парад. Еж экалагічнае.

(23.06. — 23.07.) Патрабуеш добры глыток адрэналіну. Ад шмат гадоў ты не быў так пазітыўна закручаны! Канікулы табе ўжо скончыліся, пачынаецца паласа поспехаў, моцнай актыўнасці і немалых карысцей. Ды 9-13.08. асцерагайся бравурнасці і агрэсіўнасці.

(24.07. — 23.08.) Адкрыеш у сабе арганізацыйны талент, усё будзе пасклaданае, запланаванае, хоць не страціш свае спантаннасці — будзеш напоўнены пазітыўнай энергіяй, энтузіязмам і жыццярадаснасцю (аж да 23.08.). Мілая атмасфера на працы. Калі пры захадзе сонца гнянеш у чыесь вочы — можаш страціць галаву!

(24.08. — 23.09.) Не бяры на сябе дадатковых абавязкаў, бо не дасі рады з усім справіцца. З рэалізацыяй новых задум пачакай да канца месяца. Хопіць табе цярплівасці, каб завяршыць усе важныя справы. Хоць паміж 6 і 10.08. могуць ускладніцца твае планы; з-за няўвагі можаш мець немалы клопат; не бяры цяпер ніякіх крэдытаў!

(24.09. — 23.10.) 6-10.08. адчуеш, што цябе кахаюць. Таксама сябры акажуць табе шмат доказаў сімпатыі. Да 7.08. цяжка будзе цябе задаволіць. 13.08., у час поўні Месяца, можа табе здацца, што сустрэў адзіную асобу. Не пакідай задоўга працы, каб не праваронiць важных падзей і магчымага павышэння.

(24.10. — 22.11.) Рушай у дарогу, чакаюць цябе вельмі мілыя сюрпрызы. Але і пасля вяртання на працу чакаюць цябе таксама мілыя неспадзеўкі. Заззяеш ведамі, харызмай, талентамі, пераканаеш да сваёй асобы людзей, ад якіх залежыць твая далейшая кар'ера. Людзі будуць цябе слухацца. Пакарыстайся раслінай касметыкай. 9-13.08. не бярыся за сілавыя развязкі, пільнуйся таксама на дарозе!

(23.11. — 22.12.) Здабудзеш сваё ва ўсіх сферах жыцця. Будзеш мець галаву да інтарэсаў і слушных выбараў. Лішак працы табе нават спадабаецца — будзеш задаволены і багацейшы. Не бойся налегчы на працу. Затое цяжкавата будзе табе з прыхамацямі і адмаўленнем ад благіх звычак.

(23.12. — 20.01.) 6-10.08. твой розум будзе цвярозы. Не апутае цябе канікулярны казанова, дакажаш лаяльнасць партнёру. Ад другой дэкады жніўня адчуеш дабрыню і падтрымку сапраўды спрыяючых табе людзей. Ды 13.08. (поўня Месяца) штосьці кепска скалькулюеш і можаш страціць крыху грошай; не перажывай, хутка адробіш шкоду.

(21.01. — 19.02.) Ідылія ў пары. Смела бярыся за выклікі, асвойвай новыя шляхі. Паміж 7 і 11.08. можа быць крыху нервова; не рэагуй злосцю, калі штосьці пойдзе не патвойму. 8-12.08. можаш збунтавацца супраць тых, хто цябе ўпарта сватае або мяшаецца ў тваю пару; але ж таксама не пераборшчвай! 13.08. добра еж, высыпайся і адпачывай.

(20.02. — 21.03.) Будзеш кіравацца інтуіцыяй і празорлівасцю, і добра на гэтым выйдзеш. 9.08. зацікавішся экалогіяй, зробіш штосьці для свету (а прынамсі для найбліжэйшай ваколіцы). 6-10.08. чакаюць цябе непаразуменні (падман, падвох). Другая і трэцяя дэкады — вельмі добры час на дыету.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клетці роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. адзінка вымярэння магутнасці электрычнага току = 22 _ 23 _ 24 _;
2. гаручая вадкасць для асвятлення, якая атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты = 9 _ 10 _ 5 _ 21 _;
3. даўняя прылада для катавання, на якой расцягвалі цела пакаранага = 4 _ 25 _ 7 _ 8 _;
4. жонка Адама = 6 _ 18 _ 17 _;
5. саванная афрыканская антылопа (*Tragelaphus*) = 16 _ 1 _ 15 _ 3 _;
6. трапічнае азіяцкае збожжа (*Oryza*) = 13 _ 12 _ 2 _;
7. чайны алкалоід = 11 _ 14 _ 19 _ 20 _.

(ш)

	1		2	3	4	5	6
		7	8	9	10	11	12
			13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24	25

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 27 нумара

Турбаза, Чорны, тры, Гобі, брыгада, накрыўка, кветка, цень, Поці, магній, шынель, боязь.

Рашэнне: **На базары і бык цельны, і певень з яйцом.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

Завяршыўся IV Міжнародны фестываль музыкі, мастацтва і фальклору „Падляшская актава культур”. На беластоцкім Гарадскім пляцы перад ратушшу і ў дзевятнаццаці мясцовасцях рэгіёна выступіла больш за паўтысячы выканаўцаў з васьмі краін, у тым ліку аж чатыры ансамблі з Беларусі.

IV ПАДЛЯШСКАЯ АКТАВА КУЛЬТУР

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

— Вельмі нам міла, што пазітыўныя водгукі аб фестывалі разышліся па свеце, — гаварыў у час мерапрыемства аб яго папярэдніх выпусках Анджэй Дырдал, дырэктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры ў Беластоку, установы, якая выступіла галоўным арганізатарам імпрэзы.

Актаву ў Беластоку інаўгураваў традыцыйны парад ансамбляў з-пад каталіцкай кафедры на пляц перад ратушшу. Хоць мела яна фестывальную формулу, дык яе Міжнародная мастацкая рада (яе сябрам з'яўляецца м.інш. Ігар Лукашук са Звязу беларускай моладзі) вылучае ўсіх удзельнікаў. Так было і сёлета, калі калектывы атрымалі гравертоны з рук старшыні рады Зыгмунта Цясельскага, падляшскага маршалка Яраслава Дважанскага і дырэктара Анджэя Дырдала. Перад гала-канцэртам маршалак падвёў сёлетні выпуск:

— Падляшская актава культур гэта несумненна фестываль культуры, фестываль музыкі, песні, танца і мастацтва. Для мяне гэта перш за ўсё фестываль міжнароднага сяброўства, якое відаць было тут на кожным кроку, аказванае паміж выканаўцамі і падляшскай публікай.

Вельмі цёпла прымаліся групы з Беларусі: Дзяржаўны акадэмічны хор імя Генадзя Цітовіча з Мінска, Студэнцкі канцэртны ансамбль цымбалістаў (у прынцыпе цымбалістак) з мінскай Дзяржаўнай музычнай акадэміі „Лілія” ды — падобна як хор імя Цітовіча — вядомыя ўжо беластоцкай публіцы гродзенскія „Белыя росы” ды Тэатр Рада. Прафесар Міхал Дрынеўскі, мастацкі дырэктар хору імя Цітовіча, расказваў „Ніве” пра свой ансамбль:

— Наш хор быў сарганізаваны ў 1952 годзе, значыць, праз год будзем адзначаць сваё 60-годдзе. Яго заснавальнікам і першым мастацкім кіраўніком быў фалькларыст, этнограф і дырыжор Генадзь Цітовіч. Працаваў ён з хорам 23 гады. Наш калектыў складваецца з трох груп: харавой, балетнай і інструментальнай. Агулам выступае ў нас 138 асоб. Гэта адзіны такі хор у Беларусі, падобны да польскага „Мазоўша”. Мы займаемся перш за ўсё народнымі песнямі і беларускімі танцамі, але маем таксама творы нашых суседзяў, хоць таксама і, напрыклад, кітайскія.

Успамінаючы пра беларускі рэпертуар хору, яго мастацкі кіраўнік сказаў:

— Калі гаворка ўвогуле пра беларускія народныя песні, дык радасных сярод іх няшмат, хоць бы параўноўваючы з Расіяй. Так гістарычна склалася, што Беларусь спасцігалі войны, а акупанты пераходзілі нашу зямлю ўздоўж і ўпоперак. Мабыць, па прычыне гэтых гістарычных умоў шмат з нашых народных песень пачынаецца выклічнікам „ой!” у значэнні „ой, гора”.

Хор імя Цітовіча па-за Беластокам выступіў таксама ў Саколцы. Спецыяльны канцэрт выканаў у саборы св. Мікалая ў Беластоку. Атрымаў спецыяльную ўзнагароду (гравертон), устаноўленую падляшскім дэпутатам Робертам Тышкевічам, віцэ-старшынёй сеймавай камісіі замежных спраў, старшынёй парламенцкай групы па справах Беларусі, для найлепшага беларускага калектыву Актавы.

Хор імя Г. Цітовіча і яго кіраўнік Міхал Дрынеўскі ў праваслаўным саборы св. Мікалая

Тэатр Рада падхапіў да танца маршалка Дважанскага

Яшчэ ў час інаўгурацыі фестывалю дэпутат Тышкевіч заявіў:

— Я разумею гэтае спатканне як адну з культурных сустрэч у рамках нашага старшынства ў Еўрасаюзе.

Яўген Гладкоў, мастацкі кіраўнік „Лілліі” ў размове з „Нівай” расказваў:

— У склад нашага ансамбля ўваходзіць дзевяць дзяўчат, студэнтак старэйшых курсаў музычнай акадэміі. У вашым ваяводстве прэзентуецца сем цымбалістак. „Лілія” ўзнікла ў 1966 г. пры Дзяржаўнай музычнай кансерваторыі ў Мінску. На пачатку было цяжка, таму што мы не мелі рэпертуару напісанага спецыяльна на цымбалы. Ігралі мы перш за ўсё простыя творы, скажам, полечкі. Цяпер іграем галоўным чынам творы напісаныя спецыяльна для нас прафесійнымі беларускімі кампазітарамі, хоць таксама і класіку.

„Лілія” выканала ў Беластоку, Тыкоціне і ў Супраслі таксама некалькі твораў музыка-цымбаліста, дырыжора, кампазітара і педагога Язэпа Жыновіча:

— Нарадзіўся ён у 1907 годзе. Пісаў творы на цымбалы ў народным стылі. Першапачаткова на цымбалах можна было выконваць толькі простыя народныя творы. Пасля рэканструкцыі гэтага інструмента можна было выкарыстаць поўную музычную гаму і ўзбагаціць рэпертуар. Калісь у Барысаве ў Мінскай вобласці была фабрыка піяніна, якая рабіла таксама цымбалы. Чатыры гады таму яе закрылі з-за нерэнтабельнасці. Таму іграем на старых цымбалах, выробленых у XX стагоддзі.

Мастацкі кіраўнік ансамбля „Белыя росы” Вера Чычына расказвала нам пра свой калектыў (група выступіла ў Беластоку і ў Бельску-Падляшскім):

— Наша група ўзнікла ў 1987 г. Чэрпаем з беларускай традыцыі. Маем чатырыста пяцьдзесят касцюмаў тканых і гафтаваных беларускімі майстрамі.

Выказала радасць:

— Нас заўсёды, калі прыязджаем у Беласток, прымаюць вельмі горача. Таму паяўляемся тут вельмі ахвотна.

Цыганскі Тэатр Рада паказаўся на Актаве ўжо трэці раз (сёлета ў Беластоку, Нараўцы і Васількаве). І ў гэты раз прынялі яго гарачымі апладысментамі. Паказаў праграму, на якую складваліся песні і танцы з казацкай традыцыі м.інш. у Беларусі. У час гала-канцэрта ў Беластоку Тэатр Рада прыпомніў цыганскія песні і танцы. Да танцаў перад сцэнай падхапіў нават маршалка Дважанскага. Ігар Суворкін сказаў „Ніве” пра змены, якія адбыліся ў калектыве на працягу года:

— Узніклі новыя праграмы. Дайшлі да нас новыя ўдзельнікі, дык маем у ансамблі цяпер 32 асобы. Прыехала нас 21 асоба. Сталі мы гарадскім, дзяржаўным музычным тэатрам. Раней мы прыязджалі да вас як арт-студыя.

І дадаў:

— Казакі ў Беларусі пасяліліся ў Магілёўскім раёне. Іх творчасць мае беларуска-палескі каларыт.

Сустрэты на адным з канцэртаў гісторык Алег Латышонак тлумачыў: „Казакі ў Беларусі былі ўжо ў XVII стагоддзі. Прымалі ўдзел у паўстанні Хмяльніцкага”.

Можна спадзявацца, што праз год Падляшская актава культур будзе мець асаблівы характар. Будзе яна пятая, юбілейная. Сёлета, як і ў мінулых гадах, над гэтай імпрэзай патранаж трымала „Ніва”.

ISSN 0546-1960